БЕЛАРУСКАЯ МАЛАДЗЁЖНАЯ ГАЗЕТА

ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

21 мая 1994 г.
Субота
№ 54(13771)
Кошт у розніцу 100 рублёў
Выдаецца з 1921 года

У НУМАРЫ:

☐ *Нататкі падарожніка.* АТРУЧАНАЯ ВАДА. 2

☐ *Крымінальнае бюро.* БЕРАЖЭ АДНА МІЛІЦЫЯ... 2

☐ *Адам і Ева.* СНІД: ДЫЯГНАЗ ЦІ ПРЫГАВОР? 3

ГАРАСКОП НА ТЫДЗЕНЬ, КРЫЖАСЛОЎ, ПРАГРАМА ТЭЛЕБАЧАННЯ. 3–4

Малюе Віктар ДУБОВІК

Залатая пара вясны — час майскага цвіцення, духмяных водараў, якімі шчодра адорваюць дрэвы і травы. Сёлета росквіт прыроды, бадай, крыху прыпазніўся. Тым больш адчувальны веснавы покліч. У вольны час людзі спяшаюцца на ўлонне прыроды, каб адчуць свежы подых маладой ізумруднай лістоты. Усё нібыта нагадвае — хутка золак лета, упрыгожанага чэрвеньскай чырванню высокага сонца. Як бачым, у гаях дый на лясных дзялянках адбываюцца самыя нечаканыя сустрэчы. Юнай "амазонцы", напэўна, прыемна, што вартаўнік парадку ахоўвае яе нават і на коннай вандроўцы.

Фота Сяргея ХАЛАДЗІЛІНА.

Кур'ер "ЧЗ"

Еўрапейскія газеты ў Мінску

З пачатку гэтага месяца ў Мінску свабодна можна купляць заходнюю прэсу — не была б толькі кішэня пустой.

Дырэктар мінскага "Белсаюздруку" Ларыса Шаблоўская ў інтэрв'ю карэспандэнту "Чырвонай змены" паведаміла, што еўрапейскія ды амерыканскія газеты і часопісы трапляюць да нас у дзень свайго выхаду. Таксама і падпіску можна аформіць. Дастаўляецца прэса самалётам з Германіі. Дастаўка аднаго выдання абыходзіцца ў 1,5—2 дойчмаркі, якія дадаюцца да ягонага кошту. За перыяд з 5 па 17 мая ўжо раскуплена газет і часопісаў на суму, якая складзе больш чым 8 мільёнаў беларускіх разліковых білетаў. Як падкрэсліла Ларыса Кузьмінічна, гандаль замежнай прэсай добра ідзе ў гасцініцах, а вось у магазінах — пакуль не вельмі. Вядома, не кожнаму па сродках пачытваць газеткі коштам ад 20 да 90 тысяч беларускіх рублёў.

Святлана КУЛІКОВА.

У Прэзідыуме – пра мову

18 мая пад старшынствам Мячэслава Грыба адбылося пасяджэнне Прэзідыума Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь. Сярод іншых разглядзена пытанне аб ходзе выканання Закона "Аб мовах у Рэспубліцы Беларусь".

З дакладам выступіў старшыня Камісіі па адукацыі, культуры і захаванню гістарычнай спадчыны Ніл Гілевіч. Ён абгрунтаваў неабходнасць стварэння пры Савеце Міністраў урадавай структуры па забеспячэнню адзінай моўнай палітыкі ў рэспубліцы, прынята мер па распаўсюджванню дзяржаўнымі органамі, падначаленымі ўраду, нарматыўных актаў, накіраваных на выкананне Закона "Аб мовах у Рэспубліцы Беларусь". Па прапанове Мячэслава Грыба вырашана стварыць рабочую камісію на чале з намеснікам Старшыні Вярхоўнага Савета Іванам Бамбізай для падрыхтоўкі пастановы па гэтаму пытанню з улікам заўваг і прапаноў, выказаных членамі прэзідыума.

Слоўны казус з Віцебску

Філалагічны руска–беларускі казус упершыню стаў прадметам судовага разгляду ў Віцебску.

Клуб выбаршчыкаў "За дэмакратычныя выбары", які існуе тут з часоў СССР, звярнуўся ў суд з іскам да гарвыканкама, які адмовіў яму ў паўторнай рэгістрацыі на той падставе, што ў статуце клуба адлюстравана імкненне звергнуць уладу насільным шляхам. Прадстаўнікі іскавога боку даказваюць, што слова "знішчыць" ужыта ў сэнсе "ліквідаваць", а ўся фраза ў статуце заканчваецца выразам "заканадаўчым шляхам". Па просьбе адказчыка суд адклаў пасяджэнне, каб прыцягнуць у якасці экспертаў па спрэчнаму пытанню сталічных вучоных.

Ураган над Брэстам

У адну з мінулых начэй над Брэстам пранёсся моцны ўраган.

Пры шквальным ветры начное неба раздзіралі маланкі, якіх даўно не бачылі гараджане, грымеў гром. Грозная стыхія нарабіла нямала бед, ламаючы дрэвы, выварочваючы іх з карэннем. Паваленыя дрэвы на рагу бульвара Шаўчэнкі і вуліцы Набярэжнай. Некаторыя з іх, падаючы, зачапіліся за бліжэйшыя дамы, пашкодзіўшы балконы. Пацярпелі таксама падвесны мост ля Брэсцкай крэпасці, камерцыйныя кіёскі, прыватныя дамы грамадзян, асабістыя аўтамашыны. Як паведаміў першы намеснік старшыні гарвыканкама Васіль Рапека, на шчасце, абышлося без чалавечых ахвяр. І, гаворачы аб стыхіі, ён выказаў сур'ёзныя прэтэнзіі да службы метэаролагаў, якая не толькі загадзя не папярэдзіла, але нават не паведаміла аб стыхіі хоць бы за 10—15 мінут. Дарэчы, паводле слоў Васіля Міхайлавіча, такое здараецца не ўпершыню.

Што ж датычыць самой сітуацыі, то кіраўнікі горада адразу ўзялі яе пад кантроль, дзейнічалі дакладна і аператыўна. Ужо к гадзіне ночы за работу ўзялася аварыйная служба, спецаўтабазы, якія расчышчалі ў першую чаргу праезную частку вуліц, распіловвалі завіслыя дрэвы ля жылых дамоў. Працавала таксама брыгада па ліквідацыі пашкоджанняў электрасеткі. А раніцай ім на дапамогу прыйшлі работнікі жыллёва-камунальных участкаў. Дзякуючы гэтаму ўдалося забяспечыць нармальную работу пасажырскага транспарту, важнейшых сістэм жыццезабеспячэння горада.

"Змей" спакусіў?

Пра непрыемны інцыдэнт, які адбыўся ў апошнія дні збору подпісаў за вылучэнне кандыдатамі ў прэзідэнты, паведаміла брэсцкая абласная газета "Заря".

У сярэдзіне дня ў памяшканні, дзе мясцовыя дэмакраты арганізавалі пункт збору подпісаў у падтрымку лідэра БНФ Зянона Пазьняка і экс-спікера беларускага парламента Станіслава Шушкевіча, раптам з'явіліся тры пінскія камсамольцы. Як сведчаць відавочцы, яны былі нецвярозыя. Відаць, гэта і садзейнічала таму, што палітычныя дэбаты перараслі ў бойку. Ваяўніча настроеную моладзь удалося "камандзіраваць" у міліцыю. Але, паводле некаторых звестак, яны былі адпушчаны з мірам.

БЕЛІНФАРМ.

Аўкцыённыя страсці

У Жлобіне ўпершыню прайшоў аўкцыён па продажу аб'ектаў гарадской камунальнай маёмасці.

Хаця яго ўдзельнікі і не вызначаліся асаблівай актыўнасцю (не ўдалося знайсці купцоў на буйнейшыя аб'екты аўкцыённага продажу: недабудаваны кандытарскі цэх і будынак аднаго з клубаў), агульная сума, якую выклалі на аўкцыёне прадпрымальнікі, перавысіла 16 мільёнаў рублёў.

Мікалай ШУКАНАЎ.

Чытачоў вітае "Свіцязь"

Першы нумар рэгіянальнага гісторыка–культурнага часопіса "Свіцязь" — выдання абласнога аддзялення Беларускага фонду культуры, выйшаў у Гродна.

"Мы будзем друкаваць даследзіны па гісторыі Гарадзеншчыны, яе культуры з даўнейшых часоў да сённяшняга дня, знаёміць чытача з творамі нашых землякоў. На старонках часопіса знойдзецца месца для публіцыстычных артыкулаў, інтэрв'ю навукоўцаў, літаратараў і мастацтвазнаўцаў, а таксама архіўных матэрыялаў, мемуараў і пісьмаў", — заявіў у звароце да чытачоў галоўны рэдактар новага выдання, прарэктар Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта, старшыня абласнога аддзялення БФК прафесар Сяргей Габрусевіч.

Выдаваць часопіс плануецца чатыры разы на год.

Лілія АСТРАВЕЦКАЯ.

Дзе ты нарадзіўся?

Скажы мне, дзе ты нарадзіўся, і я скажу, хто ты. Можна і такім чынам перайначыць вядомую прыказку. У Оршы па ініцыятыве групы краязнаўцаў з таварыства "Повязь", а таксама сяброў гарадской рады Таварыства беларускай мовы, работнікаў гістарычнага музея і аршанскага радыёвяшчання праведзена віктарына пад назвай "Мой родны кут".

Сярод пераможцаў віктарыны, акрамя дарослых, ёсць і дзеці. Яны атрымалі права бясплатнага наведвання ўсіх музеяў і выставачных залаў Оршы. Акрамя таго, паедуць на экскурсію ў Брэст.

Маўчыць, як... гарвыканкам

У пасёлку Тарным, што ў Віцебску, усю вясну маўчыць радыё.

Сувязісты ўзяліся былі замяніць старыя слупы на бетонныя, ды раптам успомнілі, што сродкі на набыццё лінейных матэрыялаў інфляцыя языком злізала. Між іншым, зараз, каб перанесці лінію ўсяго на адзін кіламетр, патрэбны 1,4 мільёна рублёў. Звярталіся сувязісты па дапамогу ў гарвыканкам, аблвыканком і нават Міністэрства сувязі, і ў адказ было жалезабетоннае маўчанне. Праўда, у гарвыканкама, нарэшце, не хапіла цярпення маўчаць, і ён коратка адказаў: "Адмовіць".

Уладзімір МІХНО.

Курсы валют на 20 мая:

	Даляр ЗША		Нім. марка	
	Скупка	Продаж	Скупка	Продаж
"Комплекс"	18200	18750	10900	11300
"Пошук"	18700	19200	11200	11700
"Прыор"	19200	19800	11500	11850

ПРЭЗІДЭНЦКІ МАРАФОН: ПАЗІЦЫІ, ДУМКІ, МЕРКАВАННІ

Цень "воіна", або Чым пагражае Беларусі „сіндром Жырыноўскага"

☐ Якаў ЯСЭПКІН, "ЧЗ"

Даволі адметнае, каб не сказаць болей, сяўленне ў шэрагу "палярных", а асабліва ў электронных і радыйных сродках масавай інфармацыі ходу перадвыбарнай барацьбы наводзіць на роздум. Складаецца ўражанне, што ў пэўных выпадках мінімальнае накіраванне інфармацыйнай плыні ў "патрэбнае" рачышча, бадай, не дае чакаемага эфекту. І нават упаўне можа прывесці да адваротнага выніку.

Аб чым даведваецца апошнім часам беларускі выбаршчык? Аб тым, што адзін з рэальных прэтэндэнтаў на пасаду амаль штодня сустракаецца з насельніцтвам, растлумачвае свае погляды, абмяркоўвае надзённыя праблемы, адказвае на пытанні. А дзе ж астатнія ўдзельнікі зусім не жартоўнай барацьбы? Здаецца, яны аказаліся ў цені. Але гэта не так. І ўсе пра тое даведаюцца, калі (пасля афіцыйнай рэгістрацыі Цэнтрыбаркамам кандыдатаў) змагарам за прэзідэнцкае крэсла, згодна з заканадаўствам, будуць прадастаўлены роўныя магчымасці для таго, каб сказаць народу свае Слова. Народ пачуе яго бліжэй да прыняцця рашэння, з ім на слыху і пойдзе на выбарчыя ўчасткі. Падкрэслім: тыя прэтэндэнты, якія цяпер нейкім чынам абмежаваны ў магчымасцях "галоснага" абгрунтавання сваіх пазіцый (не так важна, што яны часта "ходзяць у народ", але аб гэтым з'яўляецца даволі сціплая інфармацыя), калі такія магчымасці атрымаюць, – апынуцца ў выйгрышным становішчы.

Пачнецца іх хуткая "легалізацыя". У электронна-паперовым інтэр'еры стромкія постаці прэтэндэнтаў імкліва вырастуць у памерах. Сказаць жа будзе аб чым. Можна не сумявацца: кожны зробіць адным з "канькоў" немагчымасць больш раннягa выхаду на агульнарэспубліканскую аўдыторыю. Улічваючы прамоўніцкія здольнасці кандыдатаў і верагоднасць таленавітага правядзення выбарчай кампаніі ўжо ў іншым, "галосным" вымярэнні, лагічна зрабіць выснову: яны атрымаюць карт-бланш. Дарэчы, не апошнюю адмоўную ролю і цяпер адыгрывае ў дастатковай ступені аднабаковая, амаль што афіцыёзная прапаганда – людзі заўсёды з насцярогай ставіліся да яе, у агульным звычкі ўвайшла традыцыя ўспрымання не з адваротным знакам.

Адзін-два прыклады з мноства. "Крыніца" драматычна паведамляе рэспубліканскаму слухачу, што высокаму начальству не падабаецца яе "палітызаванасць" і, магчыма, яе перапрафілююць. "Панарама" беларускіх навін выхоплівае з вялізнага артыкула ў "Народнай газеце" пад назвай "Невядомы Пазьняк" маленькую шматку з ацэнкай лідэрам БНФ дзейнянь Лукашэнкі-актыкарупцыянера (якая, на думку складальнікаў праграмы, б'е і па таму, і па другому), падаючы яе як "самастойную" навіну. Усё гэта паўтараецца бясконца і ўяўляе сабой мядзведжую паслугу ўладатрымальнікам. У апанентаў з'явіцца дадатковы козыр, прычым, неблагі.

Сумны вопыт такой залішняй ангажыравакасці інфармацыі мае Масква. Апошні парламенцкі выбарчы працэс, здавалася б, развіваўся па стандарту. Але каноны разбурыліся літаральна на вачах пасля ўзнікнення на тэлеэкранах галоўнага ліберал-дэмакрата (былі і іншыя прыклады, аднак возьмем самы ўражальны). Простыя словы, дасціпныя думкі, ружовыя абяцанкі, абяцаючае прэзідэнцыю – звычайны перадвыбарны набор. Плюс прамоўніцкі талент, праўда, разлічаны ўпна не на інтэлектуальнага гледача. Але ж спрацавала. Нават настолькі дзёсна, што сам Уладзімір Вольфавіч Жырыноўскі такога не чакаў ? Пры абвяшчэнні ў прамым тэлеэфіры першых рэйтынгавых вестак з трайным поклічам "Ура!" глынуў старога добрага шампанскага. Было ад чаго. Калі б ён не быў "пацешнай забаўкай" на ТБ і меў частую магчымасць выказвацца, гаварыць не было б пра што.

Строга кажучы, ён толькі зрабіў ход "Е2-Е4". Гэтага і хапіла. Каго з ліберал-дэмакратаў у Думе цяпер занадта непакоіць выдадзеныя мільёнам вельмі ўжо даверлівых людзей кредыты – абяцанні ледзь не райскага жыцця на другі дзень пасля галасавання. Згуляўшы ролю "воіна-ратавальніка", Жырыноўскі дасягнуў мэты і цяпер глядзіць наперад. Тым часам фігура яго працягвае палялічацца ў памерах. Такія ж запатыя эксцэлі народнага даверу можа "з лёгкасцю незвычайнай" атрымаць і хто-небудзь на Беларусі. Умовы для гэтага стварэюцца нібыта па заказу. Своеасаблівы сіндром Жырыноўскага можа стаць лёгкай з-за пратэсту многіх супраць сённяшніх варункаў жыцця. Але тады не будзе важна, што яго выклікала, бо цень "воіна" перастане быць толькі адзнаку.

Скандал у высакародным сямействе

☐ Андрэй ВАСІЛЕВІЧ

Як вядома, Закон па выбарах прэзідэнта дае дзве магчымасці вылучэння кандыдатаў: адна шляхам збору не менш як 100 тысяч подпісаў, другая — не менш чым 70 подпісаў народных дэпутатаў Рэспублікі Беларусь.

Другі варыянт у якасці страхавачнага выбралі двое: Вячаслаў Кебіч і Генадзь Карпенка. Першаму не складала вялікіх цяжкасцей сабраць патрэбную колькасць дэпутацкіх аўтографаў.

А вось Генадзь Карпенка вымушаны быў правесці нялёгкую кампанію. Вынік атрымаўся нядрэнны. 79 дэпутатаў паставілі свае подпісы ў падтрымку Генадзя Карпенкі, з іх сем членаў Прэзідыума Вярхоўнага Савета.

Пасляхова прайшоў і збор подпісаў на карысць Карпенкі і сярод грамадзян (звыш 110 тысяч подпісаў). Гэта відаць, напалохала яго сапернікаў.

Нечаканы ўдар у спіну Карпенкі нанеслі, здавалася б, саюзнікі-дэмакраты. У Цэнтральную выбарчую камісію паступіла заява ад дэпутатаў фракцыі Сацыял-дэмакратычнай грамады, якую ўзначальвае Алег Трусаў, аб адкліканні сваіх подпісаў, што былі пастаўлены на карысць Карпенкі.

Можна зрабіць прагноз, што А.Трусаў і яго паплечнікі такім чынам рабілі палёгку для Станіслава Шушкевіча, расчышчаючы яму дарогу да прэзідэнцкага крэсла шляхам маральнай ліквідацыі сапернікаў.

Ці мае сам Шушкевіч дачыненне да адклікання дэпутацкіх подпісаў, мне невядома. Зразумела, што гэтых каманд не знойдзеш у дакументах і пратаколах.

А вось тое, што Алег Трусаў паўплываў на членаў грамады, можна здагадацца з вялікай доляй верагоднасці. Тыя дэпутаты, з кім удалося гаварыць, разумеюць, што чахарда з подпісамі выглядае, мякка кажучы, несімпатычна. Спасылкі на патрабаванні партыйнай дысцыпліны даволі дзіўныя.

Сітуацыя з дэпутацкімі подпісамі на карысць Карпенкі на сённяшні дзень выглядае заблытанай. Паводле сведчання кваліфікаваных юрыстаў, дэпутат, які ставіў подпіс, як бы апусціў бюлетэнь у выбарчую ўрну. Адтуль ужо бюлетэні па нейчай прыхамаці не выдаюцца. А спрачныя сітуацыі вырашаюцца праз суд.

Цэнтральная выбарчая камісія ўжо прымала адно рашэнне, звязанае з адкліканнем подпісаў, калі пэўная частка членаў "Славянскага сабора" ўзбунтавалася супраць Аляксандра Лукашэнкі і пагражала забраць сабраныя імі подпісы. У тым выпадку камісія пад старшынствам Аляксандра Абрамовіча прыняла вердыкт, які недвухсэнсоўна забараняў усялякія адкліканні.

Што будзе цяпер? Юрыдычны бок справы зразумелы, гульняў у важнай справе не павінна быць. Праўда, як часта бывае ў нас, юрыдычныя аргументы могуць пераважыць палітычныя. Выключэнне Генадзя Карпенкі выгадна не толькі Станіславу Шушкевічу, але і Вячаславу Кебічу, і Аляксандру Лукашэнку, і Зянону Пазьняку...

Здзівіў палітычны сакт і Зянон Пазьняк. Відаць, пад уплывам салідная лічбы — 230 тысяч подпісаў — ён заклікаў Станіслава Шушкевіча і Генадзя Карпенку зняць свае кандыдатуры. Сэнс закліку ясны, як вясеннае неба: я першы, я лепшы, я перамагу, толькі дапамагайце мне.

Наколькі я ведаю, заява Пазьняка ў групах Карпенкі і Шушкевіча нічога, акрамя іранічных усмешак, не выклікала.

Ф. СП-1

Міністэрства сувязі і інфарматыкі Рэспублікі Беларусь

АБАНЕМЕНТ на газету 63129 (Індэкс выдання)

ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА Колькасць камплектаў

на 1994 год па месяцах

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12

Куды (паштовы індэкс) (адрас)

Каму (прозвішча, ініцыялы)

ДАСТАВАЧНАЯ КАРТКА

ПВ | месца | літар

на газету 63129 (Індэкс выдання)

ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

Кошт: падпіскі ____рублёў. пераадрасоўкі ____рублёў. Колькасць камплектаў

на 1994 год па месяцах

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12

Куды (паштовы індэкс) (адрас)

Каму (прозвішча, ініцыялы)

"Суперчэннэл" — "Уорлднэт"

ДЗЕВЯТАЕ НЕБА



Дзяжурны па выпуску — П. СІМАНАЎ.

Смерць першай лэдзі

Жаклін Кенэдзі, удава былога прэзідэнта Джона Кенэдзі, амерыканскі сімвал элегантнасці і жаночай сілы, памерла пасля аперацыі па выдаленню ракавай пухліны. Ёй было 64 гады.

Заўсёды незадаволеныя еўрапейцы...

Згодна з апытаннем грамадскай думкі, праведзеным у 12 еўрапейскіх краінах, 3 з 4 еўрапейцаў не задаволены тым, як іх урады кіруюць краінамі.

Вынікі апытання паказалі, што звыш палавіны рэспандэнтаў не задаволены кіраўніцтвам Еўрапейскага Супольніцтва. Тры чвэрці апытаных у Ірландыі, Бельгіі і Італіі падтрымалі ўвядзенне адзінай еўрапейскай валюты, але больш як 50 працэнтаў датчан, немцаў і англічан выступілі супраць гэтага.

Іран супраць спадарожнікавага TV

99-гадовы іранскі аятала забараніў прагляд праграм спадарожнікавага тэлебачання.

Ён заявіў, у прыватнасці, што ўстаноўка спадарожнікавых антэн "робіць ісламскае грамадства адкрытым для аказання на яго негатыўнага ўплыву заняпалай культуры і распаўсюджання небяспечных заходніх хвароб сярод мусульман".

Багач ці бядняк?

Агульныя зберажэнні прэзідэнта ЗША Біла Клінтана і яго сям'і складаюць суму паміж 633015 і 1620000 даляраў. Аб гэтым сведчаць формы падатковай справаздачнасці, якія Клінтаны запоўнілі і аддалі галоснасці на гэтым тыдні.

Зберажэнні мужа-прэзідэнта ў 20 разоў меншыя за сродкі Хілары Клінтан.

(Працяг на 3-ц стар.).

ПАВЕДАМЛЕННІ, АТРЫМАНЫЯ ПА КАНАЛАХ СПАДАРОЖНІКАВАЙ СУВЯЗІ "ЧЫРВОНАЙ ЗМЕНЫ"

БІЗНЕС-КЛАС

Вядучая рубрыкі Вера ПАЛЯКОВА

Тэл. 68-28-52

Выставы міжсезоння

Фірма "Экаінфармсістэм" з 31 мая па 6 чэрвеня ў Мінску плануе правесці цэлы блок выстаў.

Наведвальнікі змогуць пазнаёміцца з рознымі маркамі не толькі айчынных, але і замежных аўтамабіляў, нагледзець для свайго офіса ці кватэры прэстыжную мэблю, набыць выдатныя прадукты харчавання. І, безумоўна, можна будзе наладзіць дзелавыя кантакты з рознымі фірмамі, якія прадстаўляць сваю прадукцыю.

Тры выставы з вызначанага блока пройдуць у памяшканні "Белінпраект", астатнія ў "Аўтаімпэкс" і іншых залах.

Святлана КУЛІКОВА.

* * *

23 мая ў Рэспубліканскім выставачным цэнтры пачне працаваць спецыялізаваная аптовая выстава "БЕЛТЭКСПО-94", арганізаваная канцэрнам "Беллегпрам" і Міністэрствам гандлю рэспублікі. Удзел у выставе прымуць, акрамя прадпрыемстваў Беларусі, прадстаўнікі лёгкай прамысловасці краін СНД і Прыбалтыкі, прапанаваўшы тэкстыль, трыкатаж і вырабы з яго, фарнітуру, а таксама абсталяванне і агрэгаты для швейнай і трыкатажнай вытворчасці.

Яшчэ адзін фонд

З мэтай прадастаўлення пазык беларускім фірмам пад ільготных працэнты і аказання кароткатэрміновай фінансавай дапамогі для развіцця або рэканструкцыі вытворчасці, а таксама як гарантыі для атрымання крэдытаў, кіраўніцтва Саюза прадпрымальнікаў, Беларускага саюза прадпрымальнікаў і арандатараў і Беларускага фонду фінансавай падтрымкі прадпрымальнікаў вырашылі стварыць Цэнтралізаваны інвестыцыйны фонд пры БФФПП. Новы фонд будзе фарміравацца з добраахвотных адлічэнняў членаў двух саюзаў.

Каб атрымаць пазыку, неабходна мець дазвол наглядальнага савета, у склад якога ўвойдуць прадстаўнікі арганізацый — заснавальнікаў фонду, а таксама станоўчае заключэнне экспертаў аб мэтазгоднасці выдзялення сродкаў у кожным канкрэтным выпадку.

Непатрэбныя чэкі?

З васьмі мільёнаў жыхароў рэспублікі, якія маюць права на атрыманне імянных прыватызацыйных чэкаў (ІМЧ "Маёмасць") на сённяшні дзень у камісіі па складанню спісаў грамадзян пры выканкамах сельскіх, пасялковых, гарадскіх і раённых Саветаў народных дэпутатаў, а таксама ў жыллёва-эксплуатацыйныя службы па месцы жыхарства звярнуўся кожны шосты.

Такая інфармацыя паступіла з упраўлення арганізацыі чэкавай прыватызацыі Міндзяржмаёмасці. Ігнаруюць гэта мерапрыемства жыхары беларускай сталіцы і Віцебскай вобласці. У чэках "Маёмасць" тут адпаведна зацікаўлены пакуль 2,1 і 3,5 працэнта.

БЕЛІНФАРМ.

НАТАТКІ ПАДАРОЖНІКА

Атручаныя воды

□ Уладзімір БЕРАСНЁЎСКІ

Калі навокал толькі вада, то воддаль ад катамарана яна колеру цёмнага срэбра. Зблізку — рудаватая, настоеная на балотных травах, але зачарпні — чыстая аж да самага Мазыра, колькі б ні злівалі ў яе бруду Пінск ці Салігорск...

Упершыню мы ўбачылі Прыпяць каля Кудрэвічаў, там, дзе прымае яна ў сябе прыгажуню Ясельду. У сутоцы, з левага боку, прыкмецілі шызы дымкок з-за кустоў, а потым і чалавека. Ён, убачыўшы нас, памахаў рукою. Спачатку хацелі плысці міма — не ўзлюбілі мы турыстаў з вогнішчамі, бачылі скрозь, колькі яны пакідаюць на берагах пасля сябе смецця. Але ўсё ж завярнулі свой "карабель" да берага. Павіталіся. Незнаёмец хоць і размаўляў па-расейску, але спакой і памяркоўнасць сведчылі — у ім ёсць нешта паляшуцкае.

Пазней высветлілася, што ён вайсковец, падпалкоўнік, служыць у Расіі. Але ўжо некалькі гадоў запар у адпачынак едзе сюды, у глухамань, нібы лепшага месца на свеце няма.

Наш новы знаёмы яшчэ не стары, хоць з пасівелымі скронямі, жвавы. Цікава, чаму кожны год едзе ў адпачынак на Палессе, якое і радыяцыяй пасыпана, і так далёка ад месца яго жыхарства?

Аказваецца, яго бацька быў родам з гэтых мясцін, з-пад Давыд-Гарадка. Калі Чырвоная Армія вызваліла гэтую землю ад палякаў, бацьку разам з іншымі моцнымі гаспадарамі пасадзілі ў цялятнік і павезлі ў Краснаярскі край. Там тады было шмат такіх як ён, "паноў" і "падпанкаў", па сутнасці, звычайных працавітых людзей.

Бацька будучага падпалкоўніка быў хворым на адкрытую форму туберкулёзу. Яму прарочылі тады адно: магілу. Але пашанцавала. Праз паўгода, на здзіўленне ўрачоў, пачаў ачуньваць. І потым да канца сваіх дзён ён казаў: "Вялікае дзякуй знакавэдэ за тое, што выратавала мяне ад смерці..."

Упершыню пасля высылкі ён трапіў да доктара гадоў праз пятнаццаць. І той растлумачыў, што клімат для хворага аказаўся вельмі спрыяльны: лёгкія завапнаваліся, каверны зацягнуліся. Так падпалкоўнікаў бацька больш і не трапіў пад Давыд-Гарадок.

Сын быў армейскім намаліцам і старанна ўхваляў палітыку партыі і ўрада, на ахове якіх стаяла спачатку ЧК, потым ГПУ, потым НКВД... Мяняліся толькі назвы ды метады работы рабіліся ўсё больш вытанчанымі...

Мусіць, за ўсе гады існавання гэтых органаў адзіны чалавек знайшоўся на ўсім белым свеце, які дзякаваў "дабрадзеям" за сваё выратаванае жыццё. На шчасце, там пра гэта не здагадваліся.

Напэўна, такія альбо падобныя думкі з'яўляліся і ў сына. Каб гэта было не так, калі б ён не думаў пра мінулае бацькава жыцця, а разам і пра сваё ўласнае, дык не распавядаў бы ўсё гэта чужым людзям, не імкнуўся б так упарта на Палессе, на бацькаву радзіму.

— Многія афіцэры цяпер просяцца на службу ў Беларусь, — сказаў я. — А вы?

Падпалкоўнік сумна ўсміхнуўся:

— Шчыра кажучы, я ўжо да Беларусі не маю прамога дачынення. Нават у дакументах пішуся рускім. Маці мая сібірачка. Краснаяршчына, дзе нарадзіўся і вырас, моцна трымае... Бадай, памяць і любоў да зямлі продкаў мяне прыцягвае сюды, на Палессе. Таму і еду ў адпачынак. А ўсё астатняе — сям'я, дзеці, служба, — усё там, — ён няпэўна махнуў рукою на ўсход, — а потым дадаў: — Некалі ўсе народы разам жылі, а зараз адмежаваліся. Баюся, што настане час і, можа, не пусцяць мяне сюды, на зямлю продкаў. Скажы, ці так мы, людзі, павінны жыць? І хто ў гэтым вінаваты?..

Я не адказаў, і сапраўды: хто?..

Рэвізор прыехаў

Прыпяць — рака не толькі прыгожая, паўнаводная, рыбная, яна — рака-працаўніца. Амаль скрозь па ёй плывуць баржы з пяском, шчэбнем, будматэрыяламі, праносяцца імклівыя "Ракеты", пыхкаюць дымам буксіры...

Неяк на Случы каля аўтамабільнага моста, што падзяляе Гомельскую і Брэсцкую вобласці, да нас падышоў чалавек і абмацаў з цікаўнасцю наш катамаран.

— Хм, а для нас рака — месца працы, — сказаў ён. — Гляджу на вас і нават не верыцца, што на ёй яшчэ і адпачываць можна...

Чалавек гэты быў капітанам грузавога буксіра, яго судна возіць па рацэ на захад і ўсход мікашэвіцкі граніт. У адрозненне ад нас капітан плавае і ўдзень, і ўночы, калі свеціць сонца і дзьме вецер, ліе дождж. Капітан і яго маленькая каманда працуе.

— Мо сустрэнемся калі на вадзе, — сказаў нам капітан на развітанне. — Тады падыходзьце, пазнаёмім з работаю і з караблём.

Пасля Бярозцаў, мінуўшы чыгуначны мост, мы сустрэлі іншых сябрукоў, таксама працавітых, але ж у вельмі вясёлым настроі.

Яны сядзелі за драўляным сталом, застаўленым бутэлькамі, закуссю, гучна выказвалі свае эмоцыі. Нейкі маладзенькі хлопец, убачыўшы нас, падхапіўся і, пахіставаючыся, заспяшаўся да берага. Ён махаў рукамі, нешта крычаў, можа, мы і не спыніліся б, але ў нас скончыўся бензін.

Людзі, што сядзелі за сталом, былі лунінецкімі чыгуначнікамі. А справа, дзеля якой яны сабраліся, была такая. У сваім прафілакторыі, які месціўся ў дэбаркадэры выцягнутым на бераг, гэтыя людзі ўлагоджвалі інспектара-рэвізора, што прыехаў да іх аж з Мінска. Гэты малады чалавек і захапіўся нашым катамаранам, з берага ён выглядае амаль шыкоўна.

— Зрабіць! Наліць! Даць усё, што папросяць! — пачаў распараджацца рэвізор. — Што вам трэба? Бензін? Хлопцы, даць бензіну!

Але бываюць цяжкасці, якія не можа пераадолець нават усеўладны рэвізор. Пачаставалі нас толькі памідорамі ды рашткамі халоднай рыбнай юшкі, а наконт бензіну лагодна ўсміхнуліся: "Бач, чаго захацелі...".

Але ж рэвізору вельмі спадабалася наша судна. Ён, відаць, захацеў зрабіць сабе такое ж. Пачаў мераць яго ўдоўж і ўпоперак, пытаць, з чаго яго зрабілі, дзе даставалі матэрыялы. Уласна, размова вялася толькі пра дзюралевыя трубкі, усё астатняе — дошкі, жалеза, гайкі, балты...

— Без бензіну не ездзіць, — падкузьмілі мы яго, страціўшы надзею разжыцца палівам для рухавіка. — Трубы? Трубы... — не слухаючы нас, казаў ён. — Трубы я здабуду на авіярамонтным заводзе... Дошкі таксама асабіста мне дастаць — раз плюнуць...

Ён пахваліўся, што дастане іх, дакладней, украдзе праз падначаленых яму чыгуначнікаў. Мы адразу ж зразумелі: гэты хлопец здольны і бензін здабыць проста з рэчкі.

— Дык усё ж, як наконт бензіну?

Рэвізор падазваў старэйшага з брыгады, яны пашапталіся, і брыгадзір падаў нам паперку.

— Вось вам запіска, паедзеце ў Каровічы (ён назваў прозвішча). Быў, як мы таго ўдрысцілі, нездарма жыў у Каровічах. Ён зірнуў на запіску — і паўканістры мы атрымалі.

"Ну што ж, — падумалі мы, — рэвізор — ён і на Прыпяці рэвізор".

Паміж Верасніцаю і Туравам напаткалі знаёмага капітана. Калі мы расказалі гэтую гісторыю, ён не засміяўся.

— Злодзей на злодзеі сядзіць і злодзеем паганяе, — сказаў ён. — Нават на вадзе ад іх паратунку няма...

Прыпяць усміхалася зіхоткімі дробнымі хвалькамі, ад якіх у сонечны дзень рабілася балюча вачам, а думкі былі сур'ёзныя і карцела даведацца, што там, за наступным паваротам, за белаю выспаю, парослаю хмызняком...

Вада ў Прыпяці настоена на таямнічай траве арніцы. Так нам сказаў некалі дзядзька Адам, стары бакеншчык, чыя рыбацкая хата стаіць каля Нырчы, у тым месцы, дзе сустракаюцца Гарынь, Прыпяць і Лань. Асмелюся сцвярджаць, што не было на ўсім Палессі больш жывога, люднага і багатага месца, дзе б сустракаліся і рыбакі, і паляўнічыя, і розныя праезджы люд накшталт нас — на ўсіх хапала рыбы, звера, птушак, а яшчэ добразычлівасці старога, але моцнага яшчэ чалавека. Ён называў сваіх гасцей "грамадзянамі", запрашаў у хату, падносіў чарачку і расказваў розныя гісторыі. Першым разам як мы зазіталі да яго, гэта была іранічная гісторыя пра журналістаў з адной мінскай газеты. Тыя плылі аднекуль на аўтамабільных камерах і даплаваліся да таго, што вяроўкі, якія мацавалі камеры, згнілі.

— Я ім даў новыя, — казаў дзядзька Адам, хаваючы ўсмешку. — Бо нельга ж, каб людзі не даплылі да патрэбнага ім месца...

Другі раз ён расказаў пра доктара з Мінска, які ездзіць да яго штогод.

— Доктар узяў ваду з Прыпяці да сябе на аналіз, — з павагаю да навукі гаварыў стары. — І з тае пары піў яе не са студні, а выключна з рэчкі — сапраўдны лекавы настой! Паспрабуйце і вы запарыць арніку замест вашага гарадскога чаю, грамадзяне...

Даўно мы не бачылі старога бакеншчыка і нават не ведаем, ці жывы ён. Пасля чарнобыльскай катастрофы не ездзяць адпачываючыя на Прыпяць ні з Мінска, ні тым больш з Кіева, апусцелі некалі людныя берагі, здаецца, нават птушкі прыціхлі ў галлі і рэчка пацякла не так, як раней...

З поўначы нясе атручаныя воды Лань, з поўдня — Гарынь, ды і саме Прыпяць, ледзь не з вытокаў пабітая радыяцыяй, ужо не вабіць чароўнаю плынню.

А рэвізор? Ды колькі мы ні плавалі па Прыпяці пасля чарнобыльскай аварыі, ні разу яго там не сустрэлі. Людзі казалі, перавёўся ў іншы рэгіён — тут, на яго думку, жывуць толькі дурні...

■

Вясна. Час саджаць бульбу

СПАДЧЫНА

Пойдзем у музей, глянем на сябе

□ Вітаўт МАРТЫНЕНКА, "ЧЗ"

Травень багаты на святы, пра існаванне якіх мы часам нават не здагадваемся: Сусветны дзень Чырвонага Крыжа, Дзень вызвалення Афрыкі, Дзень хіміка, Міжнародны дзень музеяў і г.д. Бывае здаецца, што ніхто ў нашым асяроддзі такія святы і не святкуе, хіба толькі афрыканскія студэнты — свой дзень, а беларускія хімікі — свой. Але вось Міжнародны дзень музеяў апошнім часам прэтэндуе вылузацца за рамкі вузкага прафесійнага свята.

Шпацыруючы па горадзе ў той дзень, 18 траўня, і там, і тут адчуваеш гэтае свята. То на новую экспазіцыю запрашае музей беларускай літаратуры, то нейкую адметную прэзентацыю прапануе гістарычны музей, то вабіць шыкоўнай шыльдай музей мастацкі. А Беларускі дзяржаўны музей-запаведнік "Менка" ладзіў цэлую святочную імпрэзу.

Ад вуліцы Алаізы Пашкевіч, дзе знаходзіцца дырэкцыя музея, пасля 11-й гадзіны ў гэтую сераду пачалі рэгулярна адпраўляцца аўтобусы у вёску Строчыца. Пад адкрытым небам раскінулася экспазіцыя, проста кажучы, звышарыгінальных рэчаў: сялянскія хаты з розных рэгіёнаў Беларусі, драўляная вясковая царкоўка, млын-вятрак... Ну і, зразумела, традыцыйныя прылады працы і быту беларусаў. Не спяшайцеся з высновамі, што сярод гэтых апошніх толькі хамуты ды лапці. Быт беларускага селяніна ў мінулым дэманструе і сённяшняму чалавеку веліч шчырай душы, працавітых рук і трапнага розуму нашых продкаў.

Мы, журналісты, прыбылі сюды на свята разам з работнікамі іншых музеяў, артыстамі, школьнай і студэнцкай моладдзю. Я асабіста быў не ўпершыню, але шмат што ўразіла і мяне. Скажам, млын, пакуль яшчэ не адноўлены цалкам з-за недахопу сродкаў, уявіўся сапраўдным магутным сябрам селяніна, абаронцам прыроды і працаўніком. Мы пабывалі ва ўнутраных памяшканнях, сфатаграфаваліся ля гіганцкіх ягоных механічных прылад-рухавікоў. Зазначу, рухавікоў настолькі вечных, наколькі вечная сама прырода і чалавек у ёй.

Яшчэ адзін ашаламляльны экспанат, дастойны і Луўра і Metropolitan Muzeum, напаткалі мы ў царкве — гэта Царская брама. Золата? Не. Дрэва? Не! Гэта звычайная салома. Але што з яе могуць зрабіць чалавечыя рукі — проста цуд!

Былі, на жаль, і расчараванні на свяце. Калі непараўнальная Царская брама абуджала гонар за сваю Беларусь, за ейны народ, здольны зрабіць такое, чаго не знойдзеш нідзе ў свеце, дык што мог абудзіць народны хор "Менка", выконваючы на беларускім свяце "Парыжскае танга" па-расейску. Гэта, паверце, не заклік да нацыянальнай абмежаванасці рэпертуару, але ж французы выконваюць тое танга па-французску, немцы — па-нямецку, а беларусы... дэманструюць толькі, што не ведаюць ні мовы арыгінала, ні сваёй мовы.

Зрэшты, былі ў рэпертуары "Менкі" і беларускія песні, але і тут яны падкрэслілі, што не разумеюць, пра што спяваюць, напрыклад, "ветлую Беларусь" у вершы Н.Арсенневай яны пераставрылі ў Беларусь "светлую"... Ды й ансамбль «Церніца» здзівіў песняй пра каханне да нейкай «ганаровай дзяўчыны».

Дзякаваць Богу, гэтыя крыўдныя "дробязі" не сталі дамінантай свята. Людзі хадзілі вясковымі вулкамі арыгінальнага музея, цешыліся разважнасцю і здароўем традыцыйнага беларускага быту, шкадавалі на недахоп сродкаў, каб паказаць усё гэта на ўсю поўню.

Многія ў той дзень набылі грунтоўную кнігу А.Лакоткі "Беларускае народнае дойлідства" і тут жа здолелі атрымаць аўтограф, бо аўтар — намеснік дырэктара музея — таксама прысутнічаў на свяце.

Фота Уладзіміра ПАНАДЫ.

ПАСТАНОВА

Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь N 326

Аб матэрыяльнай падтрымцы асобных катэгорый грамадзян у сувязі са святкаваннем 50-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў

У сувязі з 50-годдзем вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Аказаць матэрыяльную падтрымку за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту:

1.1. У размеры 2 мінімальных заработных плат:

Героям Савецкага Саюза і поўным кавалерам ордэна Славы;

інвалідам Вялікай Айчыннай вайны I і II груп.

1.2. У размеры 1 мінімальнай заработнай платы:

ветэранам Вялікай Айчыннай вайны, уключаючы інвалідаў вайны III групы і асоб вольнанаёмнага саставу дзеючай арміі;

грамадзянам, якія працавалі ў перыяд блакады горада Ленінграда на прадпрыемствах, ва ўстановах і арганізацыях горада, узнагароджаным медалём "За абарону Ленінграда" ці знакам "Жыхару блакаднага Ленінграда";

бацькам, дзецям – інвалідам з дзяцінства і жонкам (не браўшым новы шлюб) ваеннаслужачых, партызан і падпольшчыкаў, якія загінулі ці прапалі без вестак у час баявых дзеянняў у гады Вялікай Айчыннай вайны;

інвалідам з дзяцінства ў выніку ранення, кантузіі ці калецтва, звязаных з баявымі дзеяннямі ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны або з вынікамі баявых дзеянняў;

былым вязням фашысцкіх канцлагераў, турмаў, гета і іншых месцаў прымусовага ўтрымання ў гады Вялікай Айчыннай вайны;

асобам, узнагароджаным ордэнамі і медалямі СССР за самаадданую працу і бездакорную ваенную службу ў тыле ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

2. Выканкамам мясцовых Саветаў дэпутатаў выплаціць аднаразовую дапамогу грамадзянам, указаным у пунктах 1 гэтай пастановы, у перыяд з 20 па 30 чэрвеня 1994 г.

3. Міністэрству фінансаў забяспечыць своечасовае выдзяленне неабходных сродкаў на аказанне матэрыяльнай падтрымкі грамадзянам, указаным у гэтай пастанове.

Старшыня Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь В.КЕБІЧ.
Кіраўнік Спраў Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь М.КАЎКО.
12 мая 1994 г.
г.Мінск.

ЦЭНЫ

Цішэй! "Зайцы" ідуць!

Ціха, без лішняга шуму зноў падаражэлі паслугі таксі.

Цяпер праехаць адзін кіламетр у таксі каштуе ўжо не тысячу рублёў, а 1400.

БЕЛІНФАРМ.

Пра індэкс спажывецкіх цэн

Дзяржаўны камітэт па статыстыцы і аналізу паведамляе, што ў красавіку ў параўнанні з сакавіком 1994 года індэкс спажывецкіх цэн склаў 128,6 працэнта.

У параўнанні са снежнем 1993 года цэны на спажывецкія тавары і паслугі павысіліся ў 2,4 раза.

* * *

У сувязі з апублікаваннем індэкса спажывецкіх цэн за красавік 1994 года Дзяржкамправы Рэспублікі Беларусь тлумачыць.

У адпаведнасці з Законам Рэспублікі Беларусь "Аб індэксацыі даходаў насельніцтва з улікам інфляцыі" і на падставе пастановы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 10 сакавіка 1994 года № 136 "Аб дадатковых мерах па сацыяльнай абароне насельніцтва" індэксацыя грашовых даходаў за красавік бягучага года, атрымліваемых з бюджэтных крыніц, ажыццёўлена ў выглядзе аднаразовага перагляду размераў аплаты працы, сацыяльных пенсій, дапамог, стыпендый, грашовага забеспячэння.

Насельніцтву, якое атрымлівае даходы з іншых крыніц, кампенсацыя страт ад інфляцыі ажыццяўляецца на падставах, прадугледжаных калектыўнымі дагаворамі (пагадненнямі).

РОЗГАЛАС

Адкрыты ліст

Пастаяннай камісіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь па пытаннях галоснасці, сродкаў масавай інфармацыі і правоў чалавека

Рост злачыннасці сярод падлеткаў і моладзі ў нашай краіне тлумачыцца не толькі крызіснай сітуацыяй, якую мы сёння перажываем. Не апошнюю ролю ў гэтым адыгрывае і недастатковы кантроль з боку дзяржавы за сродкамі масавай інфармацыі, у першую чаргу рэгіянальных кабельных тэлестудый. Не сакрэт, што яны ў сваёй большасці робяць стаўку на паказ рознага характару "боевиков", якія выхоўваюць у падрастаючага пакалення бездухоўнасць, жорсткасць і не маюць нічога агульнага з сапраўднымі духоўнымі каштоўнасцямі, што выпрацавала чалавецтва на працягу тысячагоддзяў.

Больш таго, мы лічым, што за кошт маладых душ робяцца не толькі грошы, а гатым самым пэўнымі сіламі праводзіцца свядомая работа сярод падлеткаў і моладзі па выхаванню ў іх апатыі да такіх святых пачуццяў, як павага да старэйшага пакалення, да чалавечай асобы ўвогуле, любоў да Радзімы.

Усё гэта вымушае нас звярнуцца ў Вярхоўны Савет з патрабаваннем зноў вярнуцца да гэтай праблемы, прыняць больш рашучыя меры па выпраўленню становішча. Трэба заўсёды памятаць, што будучыня — за моладдзю, і адказнасць за яе выхаванне ляжыць на цяперашнім старэйшым пакаленні.

Жлобінскі філіял Беларускай сацыял-дэмакратычнай грамады, старшыня Рыгор ПАНЧЭНЯ.

Жлобінская аб'яднаная раённагарадская Рада Таварыства беларускай мовы, старшыня Мікалай ШУКАНАЎ.

Жлобінская рэгіянальная Рада Нацыянальна-дэмакратычнай партыі, Генадзь ВАРАБ'ЁЎ.

Жлобінская абшчына хрысціян веры евангельскай, пастар Леанід СЯРЭДЗІЧ.

Жлобінскі клуб воінаў-інтэрнацыяналістаў і воінаў запасу "Абавязак", старшыня Сяргей САЎЧАНКА.

Працягваецца падпіска на "Чырвоную змену". Наш падпісны індэкс 63129. Кошт на квартал 5400 рублёў.

ПРАВЕРЦЕ ПРАВІЛЬНАСЦЬ АФАРМЛЕННЯ АБАНЕМЕНТА

На абанеменце павінен быць пастаўлены адбітак касавай машыны.

Пры афармленні падпіскі (пераадрасоўкі) без касавай машыны на абанеменце прастаўляецца адбітак каляндарнага штэмпеля аддзялення сувязі. У гэтым выпадку абанемент выдаецца падпісчыку з квітанцыяй аб аплаце кошту падпіскі (пераадрасоўкі).

Для афармлення падпіскі на газету або часопіс, а таксама для пераадрасавання выдання бланк абанемента з даставачнай карткай запаўняецца падпісчыкам чарнілам, разборліва, без скарачэнняў, адпаведна ўмовам, выкладзеным у каталогах.

Запаўненне месячных клетак пры пераадрасаванні выдання, а таксама клеткі "ПВ-МЕСЦА" робіцца работнікамі прадпрыемстваў сувязі.

КРЫМІНАЛЬНАЕ БЮРО

"Мая міліцыя мяне беражэ"

На працягу мінулага года за парушэнне антыалкагольнага заканадаўства 2844 падлеткі прыцягваліся да адміністрацыйнай адказнасці. Амаль столькі ж было выяўлена і непаўналетніх правапарушальнікаў — 2961 таксама на адну толькі Мінскую вобласць. На 28,1 працэнта павялічылася падлеткавая злачынасць, асабліва ўзрасла колькасць разнастайных крадзяжоў... Лічбы як лічбы — калі мець на ўвазе, што Мінская вобласць зусім не нейкае там крымінальнае Чыкага.

Так здарылася, што сучасныя падлеткі апынуліся ледзь ці не ў самым складаным становішчы, значна горшым, чым іншыя "узроставыя катэгорыі". Тыя, каму не пашчасціла нарадзіцца здольным да навукі або камерцыі, раптам зрабіліся нікому не патрэбнымі — ні школе, якая сярод сваіх дзесяцікласнікаў цяпер жадае бачыць калі не суцэльных выдатнікаў, то зусім і не "ціхіх троечнікаў". Ні ПТВ, якія таксама аддаюць перавагу здольным, адначасова нічога не гарантуючы сваім выпускнікам. А розныя там вытворчыя прадпрыемствы наогул паставілі перад непаўналетнімі шчыльную заслону — вядома, калі сталых работнікаў заняць няма чым... Адсюль і сумная статыстыка — кожны чацвёрты падлетак-злачынца нідзе не вучыцца і не працуе.

Вось вам "свежы" выпадак. Шаснаццацігадовая жыхарка Валожына абрабавала ўласных сваякоў. Гэта было не вельмі складана: юная зладзейка дакладна ведала, дзе дзядзька і цётка хаваюць залатыя рэчы і грошы. "Аперацыя" прайшла надзвычай удала — завітаўшы ў госці, дзяўчына як бы між іншым прыхапіла з сабою каштоўнасці і хутка ўжо абменьвалася развітальнымі пацэлункамі з даверлівымі сваякамі, абяцаючы заходзіць яшчэ... Матывы крадзяжу былі самыя банальныя: ёй проста хацелася апранацца гэтак жа, як яе больш забяспечаныя сяброўкі, мець такія-сякія дзявочыя дробязі, ды яшчэ крыху "свабодных" грошай. Бацькі ёй дапамагчы не маглі — не надта шмат зараблялі. Сама дзяўчына нідзе не працавала — ніхто не рызыкнуў узяць на работу непаўналетнюю з няпоўнай сярэдняй адукацыяй... Таксама, як і зараз, калі "страсці адкіпелі", цяжка сказаць, калі вырашыцца пытанне яе працаўладкавання.

Абуральна, што нават тыя падлеткі, якім пашчасціла знайсці работу, у рэшце рэшт звальняюцца. Дакладней, іх звальняюць, прычым, адміністрацыя прадпрыемстваў лічыць залішнім раіцца з раённымі камісіямі па справах непаўналетніх. Тое ж і з працаўладкаваннем. У Мінскім раёне 140 непаўналетніх атрымалі ад сваёй раённай камісіі накіраванні на работу, але працаўладкаваліся толькі 52. Астатнім адмовілі, хоць у тых жа саўгасаў "Бальшавік", "Буцавічы" і "Рассвет" была магчымасць узяць да сябе яшчэ некалькі чалавек.

Кожнае пятае "падлеткавае" злачынства ў вобласці адбываецца "па п'янцы". Надзвычай шмат менавіта такіх правапарушэнняў у Барысаўскім, Лагойскім, Любанскім, Мінскім і Маладзечанскім раёнах. Па-ранейшаму высокім застаецца ўзровень групавой злачыннасці. Яно і натуральна — калі крымінальныя групоўкі падлеткаў амаль што невядомыя работнікам міліцыі, вельмі проста можа адбыцца тое, што здарылася ў Вілейскім раёне: за два дні тры падлеткі ўчынілі пяць крадзяжоў, прычым тры разы — з аднаго і таго ж магазіна ў вёсцы Даўгінава, трапляючы туды праз "хлебнае" акенца. У Пухавіцкім раёне з-за міліцэйскай неахайнасці двое дарослых, якія, дарэчы, раней ужо былі ў міліцыі на ўліку, "узначалілі" групу непаўналетніх, што менш чым за год на тэрыторыі гэтага і суседняга Уздзенскага раёна сорак разоў умудрылася вызначыцца ва ўсялякіх злачынствах.

Асобная гаворка — пра школьнікаў і "пэтэвэшнікаў". Відавочна, "маладое пакаленне" вырашыла заявіць пра сябе ўсур'ёз: сёлета на "рахунку" вучняў школ вобласці 342 злачынствы супраць 316-ці год назад. А ў навучэнцаў ПТВ — і наогул 448 супраць 304-х. Практычна кожную пятую злачынную "аперацыю" гэтыя падлеткі праводзілі днём, калі павінны былі знаходзіцца ў школе пад наглядам настаўнікаў. Кожнае другое злачынства адбывалася ноччу, калі за паводзіны непаўналетніх належыць адказваць іхнім бацькам. Дзе-нідзе яшчэ можна зразумець настаўнікаў з іх маленькай зарплатай (як ім плацяць, так яны і працуюць), але даравацъ бацькам, чые дзеці растуць, бы трава ля дарогі... Атрымалася проста дзікая сітуацыя: адказнасць за выхаванне пэўнай катэгорыі непаўналетніх бацькі, педагогі ды й наогул грамадскасць пераклалі на плечы міліцыі. Забыўшыся, што асноўныя функцыі "органаў" — выкрыццё і пакаранне злачынцаў. І вельмі адносная віна міліцыі ў тым, што з такой хуткасцю расце колькасць падлеткаў, схільных да "крымінальнай дзейнасці"... Добра, што ў Смалявічах існуе "Клуб дапамогі правазахоўным органам", дзе хлопцы і дзяўчаты бавяць вольны час, займаючыся самбо і вывучаючы правазнаўства, — а ў Барысаве працуе Цэнтр псіхалагічнай дапамогі падлеткам. Але ўсё роўна гэта дробязь. Людзі з педагагічнай адукацыяй не вельмі затрымліваюцца ў міліцыі, і не варта разлічваць, што "органы" на належным узроўні будуць займацца выхаваннем "новага пакалення". Справа гэтая — адна з найважнейшых у дзяржаве, "паза межамі" якой пакуль усё яшчэ застаюцца яе падлеткі.

Іван КЛІШЭВІЧ, маёр міліцыі.

ДЗЕВЯТАЕ НЕБА

БАНКІ БУДУЦЬ...

Старшыня польскага нацыянальнага банка Ханна Гранкевіч-Вольц заявіла, што трэба чакаць паяўлення ў краіне многіх замежных банкаў.

З імі змогуць канкурыраваць толькі тыя айчынныя фінансісты, уласны капітал якіх перавышае трыльён злотых (адзін даляр ЗША каля 22.300 злотых). Такіх банкаў у Польшчы толькі 15.

...А ДАРОГ НЯМА

Утварэнне новых дзяржаў у Еўропе, спрашчэнне працэдур, звязаных са знешнееканамічнай дзейнасцю, адмена візавага рэжыму ў перамяшчэнні грамадзян выклікалі рост таварнага, пасажырскага і асабліва аўтадарожнага руху.

Яго шчыльнасць за кароткі час шматразова павялічылася. Але аказалася, што ні ў адной з усходнееўрапейскіх краін няма дарог, якія маглі б забяспечыць растучы аўтамабільны рух.

ПАВАЖАЙЦЕ СТАРАСЦЬ!

Паштовае ведамства Ізраіля выпусціла марку, якая заклікае паважаць састарэлых.

На марцы надрукавана запаведзь: "Паважайце старэйшых сваіх", а на купоне пад маркай — цытата з Біблії: "Перад асобай сівога ўставай і шануй старца". Над тэкстам намалявана аліўкавае дрэва, якое славіцца сваёй велічнасцю і здольнасцю пладаносіць нават ва ўзросце некалькіх соцень гадоў.

ДАБРАЧЫННАЯ... ГІТАРА

Акустычная гітара, якую трымалі ў сваіх руках Джордж Майкл, Пол Маккартні і Дэвід Боўі, пайшла днямі "з малатка" за 300 000 фунтаў стэрлінгаў на дабрачынным аўкцыёне ў Лондане.

Гітара прадастаўлена аўкцыёну Джорджам Майклам. Выручаныя грошы паступяць у міжнародную дабрачынную арганізацыю, якая дапамагае дзецям бедных.

ХАРЫСАН АБАНКРУЦІЎСЯ?

Былы музыкант групы "Бітлз" Джордж Харысан прадаў за 8,5 мільёна даляраў сваю кампанію па вытворчасці фільмаў канадскай фірме.

Фільмы кампаніі Харысана карысталіся незвычайным поспехам у 80-я гады. Прычынай продажу было, відаць, тое, што ў 1991 г. Харысан страціў некалькі мільёнаў даляраў з-за падзення прыбытку ад фільмаў.

КАСМІЧНАЯ КАТАСТРОФА

Паводле паведамлення спецыялістаў НАСА, у ліпені Юпітэр сутыкнецца з каметай.

Сутыкненне будзе такім моцным, што калі б на месцы Юпітэра апынулася Зямля, дык большая частка насельніцтва загінула б. На шчасце, сутыкненне адбудзецца на адлегласці 800 кіламетраў ад Зямлі. Вучоныя мяркуюць, што пры гэтым можа выдзеліцца столькі энергіі, колькі вызваліцца яе пры выбуху ўсёй ядзернай зброі, назапашанай у свеце.

МАЛАНКА ЗРЫВАЕ ГАЛАСАВАННЕ

Маланка ўдарыла ў будынак італьянскага парламента якраз у той момант, калі сенатары сабраліся, каб выказаць давер новаму кабінету прэм'ер-міністра Сільвіо Берлусконі.

У выніку інцыдэнту была парушана лінія сувязі. Кааліцыя Берлусконі ўсё ж атрымала вотум давер'я пасля таго, як былі ліквідаваны непаладкі.

ПАВЕДАМЛЕННІ, АТРЫМАНЫЯ ПА КАНАЛАХ СПАДАРОЖНІКАВАЙ СУВЯЗІ "ЧЫРВОНАЙ ЗМЕНЫ"

ТЫДЗЕНЬ ПА ГАРАСКОПУ

23–29 мая

БЛІЗНЯТЫ

Пазбягайце сур'ёзных рашэнняў у панядзелак. Пастарайцеся высветліць усе непаразуменні ў сям'і. Спрыяльны час для эратычных зносін.

Не лепшы час для заключэння фінансавых здзелак у сераду. Не сварыцеся з каханым.

У выхадныя звярніце ўвагу на сваё здароўе. Не ўвязвайцеся ні ў якія рызыкоўныя прадпрыемствы і забавы.

РАК

На пачатку тыдня, нягледзячы ні на што, можаце дамагчыся жаданага выніку. Верагодны нечаканы фінансавы паварот. У вас з'явяцца шанцы на ўдачу ў асабістым жыцці.

Прыслухайцеся да думак родных у сераду. Не спрачайцеся з супрацоўнікамі. Лепш не рызыкуйце грашыма. Будзьце гаспадаром свайго слова.

Субота прынясе шмат пачуццёвых радасцей. Не выключана цікавае знаёмства.

ЛЕЎ

Устрымайцеся ад паспешлівых рашэнняў у аўторак. Не адхіляйце каханне.

Многае будзе залежаць ад вашых знаёмых у чацвер. Займіцеся спортам.

У нядзелю будзьце асцярожныя з агнём. Не давярайце нікому ў асабістым жыцці. Верагоднасць траўм. Вырашэнне хатніх праблем.

ДЗЕВА

Пастарайцеся не перанапружваць сваю нервовую сістэму ў першы дзень тыдня. Матэрыяльнае становішча няўстойлівае. Праяўляйце рашучасць ва ўсім.

Справы, за якія вы возьмецеся ў сераду, будуць паспяховымі. Перагледзьце свае сямейныя адносіны. У грашовай сферы многае залежыць ад вас. Не заўсёды першы выйграе. Звярніце ўвагу на сваё здароўе.

Перамены ў каханні пачнуцца з суботы. Больш дыхайце свежым паветрам. Асноўныя падзеі сканцентруюцца ў сямейным коле.

ШАЛІ

У панядзелак сур'ёзна абдумайце свае паводзіны, каб не памыліцца. Будзьце актыўнымі ў каханні.

Вам пашанцуе ў чацвер у фінансавай сферы. Спрыяльныя абставіны ў сям'і.

Не злоўжывайце алкаголем у пятніцу.

У выхадныя займіцеся гаспадарчымі справамі. Стрымлівайце свае эмоцыі.

СКАРПІЁН

Пазбягайце залішняй актыўнасці ў аўторак. Адкладзіце каханне на іншы час.

Не спяшайцеся з вывадамі ў сераду. Будзьце стрыманымі ў сям'і. З'явяцца шанцы на поспех у каханні.

У суботу звярніцеся па дапамогу да сваіх сяброў у бізнесе. Удача ў асабістым жыцці.

СТРАЛЕЦ

Захоўвайце асцярожнасць у фінансавай сферы і ў гутарках з блізкімі на пачатку тыдня.

Пастарайцеся не вырашаць ніякіх юрыдычных спраў у чацвер. Наведайце сваіх сяброў. Спрыяльны час для заняткаў спортам.

У суботу вам лепш выехаць за горад. Удзяліце ўвагу дзецям. З'явіцца перспектыва паляпшэння фінансавага становішча.

КАЗЯРОГ

Уважліва сачыце за навінамі ў аўторак. Верагоднасць рэалізацыі вашых планаў. Пазбягайце канфліктаў у сям'і і з каханым.

У пятніцу не плануйце рашучых крокаў. Спрыяльны час для кахання.

Звярніце ўвагу на сваё здароўе ў выхадныя. Не вырашайце ніякіх грашовых праблем.

ВАДАЛЕЙ

У панядзелак з'явіцца шанц на ўдачу ў бізнесе. Для заспакаення пачуццяў наведайце царкву.

Не верце ўсяму, што вам скажуць у чацвер. Займіцеся спортам. Магчыма цікавае знаёмства.

Прысвяціце суботу пашырэнню свайго кругагляду. Верагодна паспяховае падарожжа. Не злоўжывайце ежай.

РЫБЫ

Не ўвязвайцеся ні ў якія грашовыя афёры ў панядзелак. Пастарайцеся не перанапружваць сваю нервовую сістэму.

Вам прыйдзецца вырашаць сур'ёзную асабістую праблему ў чацвер. Пазбягайце канфлікту. Не рызыкуйце ў бізнесе.

Нядзеля – спрыяльна для інтымных адносін. Пастарайцеся зразумець сваіх блізкіх.

АВЕН

Магчыма цудоўнае падарожжа ў аўторак. Не давярайце нікому вашых асабістых праблем. Эканоміце сілы і беражыце нервы.

У чацвер лепш не абменвайце даляры. Поспех у каханні. Не марнуйце час. Рызыкуйце ў бізнесе!

Будзьце асцярожнымі ў суботу. Магчымасць захворвання. З эротыкай лепш пачакаць.

ЦЯЛЕЦ

У першыя дні тыдня не адхіляйце каханне. Магчымы матэрыяльны прыбытак.

Пастарайцеся ні з кім не сварыцца ў сераду. Поспех у фінансавай сферы. У выхадныя будзьце ўважлівымі ў дарозе. Атрымаеце добрыя весткі здалёк.

ПРЫЕХАЛІ!

Задачка для кемлівых

□ Наталля ПЛЫТКЕВІЧ, "ЧЗ"

Дадзена: "Сям'я з трох чалавек (двое дарослых і дзіця), якая села 15 мая ў аўтобус "Капаткевічы—Мінск" (дзяржаўны нумар 84-39 МІЦ) у вёсцы Ванюжычы Петрыкаўскага раёна і запляціла вадзіцелю за білеты семдзесят тысяч рублёў, білеты гэтыя атрымала толькі ў Любані — агульным коштам сорак дзве тысячы трыста пядзьдзесят рублёў".

Пытанне "на засыпку": "Колькі грошай паклалі ва ўласную кішэню вадзіцелі за адзін рэйс пры ўмове, што аўтобус быў паўнюткі людзей?".

Ад аўтара: Дарэчы, ніводнага разу, колькі ездзіла па гэтым маршруце, мне не давялося атрымаць білет на тыя грошы, якія плаціла вадзіцелю, — калі ўвогуле той білет атрымлівала. Цікава вось толькі, куды падзеліся ў гэтай мясцовасці кантралёры і чаму не ўяўляюць небяспекі для фінансавых аперацый спрытных дзялкоў — пэўна, яны тут вымерлі. Шкада, бо сумленне, як бачым, пакуль што "кантралёр" не з лепшых.

Не прысягайце на крыві!

□ Ірына ЗАВАДСКАЯ, "ЧЗ"

— Напэўна, ізноў якая-небудзь гуманітарная дапамога. Хутчэй за ўсё, пратэрмінаваныя, — крыва ўсміхаліся грамадзяне раніцай у аўторак ля ўваходу ў метро на плошчы Незалежнасці, — але прэзерватывы бралі. Сімпатычныя дзяўчаткі, што іх раздавалі, паспявалі растлумачыць скептыкам, што прэзерватывы былі закуплены на спонсарскія сродкі спецыяльна для гэтай акцыі і маюць пэўную гарантыю якасці.

Такім чынам арганізацыя "Стоп-СНІД" і Інстытут грамадскіх сувязей імкнуліся прыцягнуць увагу насельніцтва да праблемы "хваробы стагоддзя". Да кожнай пары прэзерватываў прапаноўваліся інфармацыйныя лісткі, дзе падрабязна тлумачылася, што трэба рабіць, каб не захварэць СНІДам. Між іншым, спецыяльна для падлеткаў адзначалася і магчымая небяспека прысяг на крыві... Увогуле, насельніцтва адрэагавала станоўча, хоць большасць жанчын і спяшаліся хутчэй прайсці міма, каб пазбегнуць нечаканага "падарунка" (адна нават злосна садрала тэматычны плакат і дэманстратыўна выкінула прэзерватывы разам з інфармацыйнай брашурай, заявіўшы, што "СНІД — штучная хвароба, якой нас заражаюць спецыяльна нашыя ворагі"), затое мужчыны не саромеліся спытаць для сябе яшчэ адзін камплект. Падобная акцыя праводзілася ўжо ў чацвёрты раз, і ашоўнай масай прахожых была прызнана як вельмі карысная і патрэбная.

АДАМ І ЕВА

□ Наталля СТРАЛКОВА, "ЧЗ"

Многія мае сябры і знаёмыя не выйшлі яшчэ з таго ўзросту, калі інтымнае жыццё прыносіць задавальненне і з'яўляецца вельмі папулярнай тэмай для абмеркаванняў і каментарыяў у цесным асяроддзі. Але вось што насцярожвае. І мужчыны, і жанчыны (дарачы, людзі адукаваныя і інтэлігентныя) амаль заўсёды канцэнтруюць увагу на эмацыянальным уздыме, фізічнай асалодзе і іншых прыемных рэчах, але вельмі мала думаюць пра ўласную бяспеку. Прэзерватывамі карыстаюцца ў выключных выпадках і толькі для папярэджання цяжарнасці. Венерычных хвароб не баяцца, бо лічаць іх прыналежнасцю бомжаў і іншых "люмпенаў". Пра СНІД проста не думаюць, па-ранейшаму адносячы яго да шэрагу "экзатычных" хвароб. Пераконваць іх у адваротным, палохаючы жудасным прывідам смерці, было б проста марнаваннем часу, як увогуле пужаць каго-небудзь чым бы там ні было. Пагрозу СНІДу трэба ўсядоміць, "прапусціць" праз сябе, сваіх родных, каханых, дзяцей... Як усядоміць і адказнасць за сваё і іх жыццё. На жаль, гэта ўласціва не кожнаму.

Безумоўна, многім людзям цяжка ўтаймоўваць фізіялогію, абмяжоўваць уласныя станоўчыя эмоцыі — тым больш, калі выпадае іх няшмат, але нічога не зробіш, у хуткім часе прыйдзецца гэтаму навучыцца. Або — або. Або вы прымусіце сябе не лезці ў ложак з першай сустрэчнай прыгожанькай дзяўчынкай без дадатковых сродкаў перасцярогі, або ў недалёкім часе вашы родныя будуць вымушаны заказваць пахавальны аркестр.

Не палічыце ўсё сказанае вар'яцкімі фантазіямі на глебе снідафобіі. Чарговы званок з рэспубліканскага цэнтра па прафілактыцы СНІДу "падліў" цёмнай фарбы ў і без таго даволі змрочную карціну распаўсюджання невылечнай хваробы. Здарылася нешта своеасаблівае — ВІЧ-інфіцыраваны мужчына, які некалі даў распіску ў тым, што папярэджаны аб крымінальнай адказнасці за распаўсюджанне інфекцыі (правядзенне палавога акта без прэзерватыва), зараз захварэў... на сіфіліс. І не вельмі дасведчанаму ў медыцыне чалавеку зразумела, што свае пісьмовыя абяцанні мужчына проста-такі праігнараваў, уступіўшы ў інтымную сувязь без усялякіх перасцерагальных сродкаў... Пакуль што гэты выпадак можна назваць інцыдэнтам, аналагаў якому ў рэспубліцы яшчэ не было. Але хто сёння можа даць гарантыю, што ўсе астатнія выяўленыя вірусаносьбіты строга прытрымліваюцца сваіх распісак?

Мною, грамадзянінам краіны Беларусь, ... атрымана даведка аб выніках абследавання на СНІД. Я ведаю пра крымінальную адказнасць за заражэнне іншай асобы і папярэджаны пра забарону гомасексуальных і гетэрасексуальных кантактаў без выкарыстання прэзерватыва...".

Далей усё залежыць ад хворага, яго маральных прынцыпаў і жыццёвых установак. Са свечкай, як кажуць, ля яго ніхто стаяць не будзе. Вось тут і з'яўляецца тая палка з двума канцамі, якая ўвесь час трымае медыкаў прафілактычнай службы ў лёгкім нервовым напружанні. Яны не маюць права ні ізаляваць вірусаносьбіта ад грамадства, ні забараніць яму займацца сексам раз і назаўсёды. Ва ўсім свеце адносіны паміж урачом і падобным пацыентам будуюцца па прынцыпу ўзаемадаверу да таго моманту, пакуль ВІЧ-інфіцыраваны не пачынае гэтым злоўжываць. Імкнучыся спецыяльна, з пачуцця помсты заразіць як мага большую колькасць сексуальных партнёраў. Але не будзем упадаць у крайнасці. Без іх зразумела, што ўсе мы — людзі, якім часам бывае проста не пад сілу кантраляваць свае сексуальныя эмоцыі. Нават пад пагрозай крымінальнага артыкула. Далёка не ў кожнага хворага пачуццё адказнасці развіта настолькі, каб у патрэбны момант яго рука пацягнулася па пакецік з запаветным кандомам. Тэарэтычна такіх пацыентаў належыць прыцягваць да адказнасці. А практычна... Любы ВІЧ-інфіцыраваны, калі толькі ён сам сабе не вораг, можа сачыніць казачку пра тое, як у самы непадыходзячы момант прэзерватыў на ім проста... парваўся. Які пракурор у падобным выпадку зможа даказаць адваротнае?

На памяці Віктара Каласоўскага, урача-эпідэміолага рэспубліканскага цэнтра па прафілактыцы СНІДу, адбыўся толькі адзін судовы працэс, звязаны са свядомым распаўсюджваннем ВІЧ-інфекцыі. І той праходзіў не ў нас, а ў "блізкім замежжы". Дарэчы, самі ўрачы не з'яўляюцца ў падобных выпадках прыхільнікамі жорсткіх рэпрэсій. Карысці ад гэтага мала — больш шкоды. Калі памятаеце, існаваў у былым саюзным крымінальным кодэксе артыкул пакарання за педэрастыю (які пазней аўтаматычна перамясціўся ў беларускі КК), дзе належала прыцягваць да адказнасці не толькі гомасексуалістаў-гвалтаўнікоў, але і тых, хто займаўся "каханнем" па згодзе. І хоць на практыцы пакаранне за "ўзаемныя пачуцці" сёння практычна не прымяняецца, артыкул, які ўсё яшчэ афіцыйна існуе, адпалохвае ад цэнтра па прафілактыцы СНІДу вялікую колькасць мужчын з гомасексуальнай арыентацыяй. Яны нізашто не хочуць прызнавацца ў сваіх кантактах, не толькі ўскладняючы работу прафілактычнай службы, але і павялічваючы рызыку далейшага распаўсюджання хваробы. Менавіта гэты кантынгент пацыентаў — самы скрытны.

Медыкі ўпэўнены: калі толькі яны пачнуць праводзіць судовыя пасяджэнні і звяртацца па дапамогу да міліцыі — зараз жа распалохаюць усіх астатніх, і замест таго, каб добраахвотна звярнуцца па дапамогу ў цэнтр, хворыя "засядуць у падполлі".

Але ж і іншую крайнасць — калі, захоўваючы інкогніта пацыента, урачы не маюць права нават папярэдзіць аб небяспецы яго пастаяннага палавога партнёра, — таксама нельга лічыць нармальнай. "У ідэале мы павінны думаць не толькі пра абарону правоў хворага на СНІД, але і пра здароўе тых, з кім ён уступае ў сексуальныя кантакты. А для гэтага трэба мець законную, юрыдычную аснову, — гаворыць урач-эпідэміёлаг Наталля Фірсава. — Пакуль што здароўе і жыццё ні ў чым не вінаватых людзей трапляе ў поўную залежнасць ад настрою і прыстойнасці ВІЧ-інфіцыраванага".

Атрымліваецца замкнёнае кола, выйсце з якога можа быць толькі адно: усім, хто пакуль што здаровы, навучыцца самім засцерагаць сябе ад магчымай бяды. Прычым, самымі элементарнымі і даступнымі метадамі. Безумоўна, аптымальным варыянтам маглі б стаць узаемныя манагамныя (толькі адзін пастаянны партнёр) адносіны. Але паколькі гэта нерэальна, ёсць сэнс больш стрымліваць свае пачуцці і не кідацца ў абдымкі першаму сустрэчнаму. А калі ўжо пацярпець нельга — насіць з сабою ў сумачцы ці кішэні 2—3 прэзерватывы.

Калі нехта спадзяецца на цуды айчыннай ці замежнай медыцыны — дарэмна. На сённяшні дзень няма ні эфектыўных лекаў, ні вакцыны ад СНІДу. Распаўсюджаны прэпарат АЗТ — вельмі таксічны і можа адмоўна ўздзейнічаць на кроў. Некаторыя амерыканскія вучоныя ўвогуле лічаць яго "касметыкай для мёртвых", але, паводле іх уласных прагнозаў, якасць лекавых прэпаратаў да 2000 года наўрад ці зменіцца ў лепшы бок.

Становішча ў нашай рэспубліцы можна было б назваць адносна спакойным, калі б афіцыйна вядомая колькасць інфіцыраваных і хворых на СНІД (102 чалавекі) адпавядала рэальнай. На жаль, і аптымісты, і песімісты разумеюць, што гэта далёка не так. І калі першыя памнажаюць гэту лічбу яшчэ на дзесяць, дык другія — на ўсе сто. Не ўдаючыся ў матэматычныя падрабязнасці, скажу толькі адно: тыя, хто самастойна звярнуўся ў цэнтр або трапіў сюды ў выніку выпадковай праверкі крыві, — гэта толькі вяршыня айсберга. Усё астатняе да пары да часу хаваецца на дне і пагражае "выбухам" праз два-тры гады (паводле прагнозаў беларускіх медыкаў). Амаль кожны з вірусаносьбітаў хоць і не адносіўся да групы рызыкі, але вёў далёка не цнатлівы вобраз жыцця. Некаторыя з пацыентаў мелі "ў актыве" па 4-5 венерычных захворванняў і па 40-50 палавых партнёраў, якія, магчыма, "выплывуць" на паверхню ўжо як пацыенты цэнтра. Тое, што ў Беларусі сёння назіраецца сапраўдны выбух сіфілісу таксама не пакідае падстаў для супакаення. Быў час (недзе напачатку 60-х), калі падобных хворых можна было літаральна пералічыць па пальцах. Нават пастанова тады прымалася аб поўнай ліквідацыі сіфілісу, як "перажытку мінулага". Выканаць яе аказалася немагчымым. Толькі ў першым квартале гэтага года было зарэгістравана 400 "новых" хворых (у дадатак да ранейшых). Адна вельмі актыўная бабруйчанка заразіла 19 чалавек...

— Калі б сіндром імунадэфіцыту перадаваўся гэтак жа лёгка, як і ганарэя, мы б даўно апраўдалі самыя змрочныя прагнозы па колькасці інфіцыраваных — лічыць венеролаг рэспубліканскага цэнтра прафілактыкі СНІДу Уладзімір Залюткін. — Значная частка сённяшніх хворых прыйшла да нас праз венслужбу...

Рост венерычных захворванняў можа сведчыць толькі аб тым, што маладыя (і не толькі) займаюцца сексам усё больш актыўна і з кім папала. І нікому не прыходзіць думка пацікавіцца ў свайго выпадковага партнёра: а ты часам не стаіш на ўліку ў цэнтры? Не саромейцеся, спытайце, і па яго рэакцыі зразумееце, ці далёкія вы да ісціны.

Сіфіліс — гэта дыягназ, СНІД — гэта прыгавор. Перарастанне першага ў эпідэмію сведчыць аб поўнай "маральнай падрыхтаванасці" нашага грамадства да сустрэчы з другім.

Чамусьці ў нас не прынята пра гэта ўспамінаць, застаўшыся ў пакоі адзін на адзін са сваім сябрам. Прапанова выкарыстаць прэзерватыў або ўспрымаецца як абраза (ты мяне не кахаеш!), або тут жа выклікае падазрэнне (ужо нешта "падчапіў"!). Няма нармальнага клопату аб сваім здароўі, на жаль, няма...

Сексуальнае жыццё хворага на СНІД не забараняецца законам і... не паддаецца ніякаму кантролю. Супрацоўнікі цэнтра могуць кожны месяц забяспечваць пацыента бясплатнымі прэзерватывамі (што, дарэчы, і робіцца з поспехам), з раніцы да вечара праводзіць тлумачальныя размовы, псіхалагічныя тэстыраванні і субяседаванні. Але ўсе далейшыя дзеянні будуць залежаць ад яго самога.

Хто ён, ваш выпадковы выбраннік? Магчыма, яго імя і прозвішча строга аберагаюцца ад чужых вачэй у медыцынскіх сейфах. Не спакушайце лёс — зайдзіце ў бліжэйшую аптэку... Што б вы ні страцілі на гэтым, захаваеце значна больш — жыццё.

Прэм'ера рубрыкі: СА СКРЫЖАЛЯЎ 1994 ГОДА

Бацькаўшчына-Айчына — гэта і зямля родная, і краіна-дзяржава... Гэта святло нетраў, цеплыня спрадвечнага котлішча і кліч далягляду...

І як тут ні згадаць верш пра нашу Бацькаўшчыну, напісаны ў такі ж — падобны на наш — пераломна-апрабудны, перагружаны аглушэласцю час. У 1920 годзе Янка Купала ў сваім творы "Цару неба й зямлі" надзвычайна-роспачна згадваў Валадара Сусвету, просячы-патрабуючы заступніцтва, а таксама сілы і душэўнай моцы на абуджэнне і адраджэнне краіны:

Вярні нам Бацькаўшчыну
нашу, божа,
Калі ты цар і неба і зямлі!

Так, Бацькаўшчына нібыта вернута нам. Мы нават святкуем Дзень незалежнасці Рэспублікі Беларусь. Ці Бог пачуў нашага прарока-пакутніка, ці пашкадаваў яго нашчадкаў? А мо задаў нам задачу: а што мы будзем рабіць далей?

Спакон вякоў нашыя продкі (як бы іх ні называлі: крывічамі, русінамі, ліцьвінамі, беларусцамі) шанавалі свой Мацярык-Айчыну. І сілы гэтае любові паспрыялі ім выжыць між чужым мячом і матчыным словам на планеце ласкі пад назовам Беларусь.

Якія ж падзеі чакаюць нас у 1994 годзе? Якія даты мы будзем згадваць, з якой нагоды будзем адзначаць святы ці юбілеі або сцілна ўшаноўваць імёны слаўных нашых папярэднікаў? Перад вамі своеасаблівы каляндар-чысленік, куды са скрыжаляў Мацерыка-Айчыны ўнесены толькі паасобныя радкі. Учытаемся ў іх — і пабагацеем на падзеі. Калі мы як мага больш даведаемся, што было, то лягчэй і вызначым, што нас чакае. Угледзімся ў нашыя гістарычныя далягляды, у прамінулыя стагоддзі і запомнім іх у суадносінах з нашым днём — і лепш зразумеем нашых папярэднікаў, іх жыццё і подзвіг у імя Бацькаўшчыны. І нечаму навучымся ў іх...

Сяргей ПАНІЗЬНІК.

Адзначыць 1020 гадоў Віцебску — гэта значыць прыняць падарунак летапісца Міхаіла Панцырнага, які, магчыма, і памыліўся, пераблытаўшы 947 на 974. Археалагічныя даследаванні сцвярджаюць, што на рацэ Віцьба пасяленне існавала ў канцы X стагоддзя. Таму год 974-ы быў прыняты ўмоўна. Хаця людзі на гэтых надзвычай лагодных берагах (гарадзішча Ламіха днепра-дзвінскай культуры на былой Замкавай гары) жылі 4 тысячы гадоў таму назад.

Верхні замак, Ніжні, Узгоркавы... Хто іх узводзіў? Мо полацкі князь Брачыслаў Ізяслававіч, каб бараніцца ад надакучлівага кіеўскага князя Яраслава Мудрага? Мы так мала ведаем сваю гісторыю, што асобныя звесткі прыходзіцца прымаць напавер.

Віцебск рос і багацеў на знакамітым шляху "з варагаў у грэкі". З гістарычных датаў яго вялікага жыцця згадаем асобныя.

755 гадоў назад віцебскую княжну Параску (Праскоўю) узяў за жонку слаўнавядомы Аляксандр Неўскі. Такім чынам быў змацаваны саюз змагароў супраць крыжацкай пагрозы, і вось вынік: сумесная перамога ў Неўскай бітве (1240), на Лёдавым пабоішчы (1242).

Удумайцеся, першаму дакументу, дзе зафіксаваны асаблівасці нашае адметнае мовы, спаўняецца 765 гадоў! Гэта вынікае з гандлёвай дамовы 1229 года паміж Смаленскам, Віцебскам, Полацкам з аднаго боку, Рыгай і Готландам — з другога. Гандлёва-палітычныя стасункі Віцебска нагадваюць дыпламатыю міжнароднага класа: дзеянні нашых продкаў былі на роўных з замежнымі прадстаўнікамі еўрапейскага гандлю.

Знойдзеная ў 1959 годзе ў Віцебску берасцяная грамата нагадвае пра тое, што тут жыў не "цёмны, забіты народ", а вечавы, рамесны, мужны і вольналюбівы — з "Пагоняю" на сваіх штандарах.

У 1320 годзе Віцебск, як пасаг княжны Марыі Яраславаўны, перайшоў да князя Вялікага княства Літоўскага Альгерда. Рушыцца такім чынам яшчэ адзін міф — нібыта аб заваёве "літоўцамі" беларускіх зямель.

Напачатку Полацк, потым Наваградак, урэшце Вільня былі цэнтрамі збірання зямель. Але былі і ваяўнічыя сусядзі... Нялёгкі лёс выпаў на долю Віцебска. Вось толькі адзін горкі прыклад. З пачаткам экспансіі Маскоўскай дзяржавы на Захад Віцебск выпальваўся і спусташаўся ў 1516, 1519, 1534, 1536, 1562, 1568 гадах.

Вось у чарговы раз адбіта навала. Зноў Воля і Праца валадараць у Віцебску... У 1597 годзе ён атрымлівае Магдэбургскае права. Самакіраванне спрыяе ўздыму эканомікі, ажыўленню гандлю.

Але... 340 гадоў назад пачалася чарговая вайна з Расіяй (1654 — 1667 гг.) Зноў пралілося многа крыві віцьбічаў. Многа цудоўных майстроў было адпраўлена ў палон, а хто і па сваёй волі — працаваць у Збройнай, Залатой, Срэбнай палатах Маскоўскага крамля.

Поўным выпаленнем быў пакараны Віцебск у новай Паўночнай вайне, у 1708 годзе — толькі за тое, што мяшчане не далі фуражу для войска Пятра I.

У 1772 годзе, пасля I-га падзелу Рэчы Паспалітай, Віцебск у складзе Расіі. А напалеонаўскае нашэсце прынесла новыя страты: у 1812 годзе ў Віцебску было 7808 мужчын, у 1813 — толькі 2415. Згадаем з нагоды трагічныя лічбы гітлераўскага вынішчэння: з 180 тысяч чалавек, якія пражывалі ў Віцебску да пачатку 1941 года, пасля вызвалення ў 1944 годзе засталося 118 (сто васемнаццаць!).

Віцебск застаецца ў памяці нашчадкаў не толькі прыкладамі ахвярнасці. Віцебск ва ўсе часы нараджаў таленты, гадаваў іх і рассылаў па свеце. Тут С. Аверка пісаў свой летапіс. У энергетычным полі Віцебска чэрпалі натхненне Ф. Багамолец, А. Рыпінскі, Ф. Рысінскі, Т. Лада-Заблоцкі, А. Пагодзін, А. Вярыга-Дарэўскі, Е. Раманаў, А. Сапуноў, М. Нікіфароўскі...

У свой час Віцебск наведвалі Г. Дзяржавін, А. Пушкін, М. Гогаль, Т. Шаўчэнка, А. Дэльвіг, І. Лажэчнікаў, І. Бунін, Г. Успенскі, С. Маршак, А. Грын, А. Талстой, Я. Райніс, У. Маякоўскі, П. Антакольскі, А. Твардоўскі, К.Паўстоўскі, М. Святлоў...

Тут жылі, вучыліся, працавалі В. Быкаў, А. Асіпенка, Л. Прокша, В. Іпатава, Н. Тулупава, Л. Дайнека, Я. Шабан, У. Скарынкін...

Віцебск на ўвесь свет праславілі такія майстры, слугі мастакоўскай музы, як М. Дабужынскі, Я. Мінін, К. Малевіч, Ю. Пэн, С. Юдовін, М. Шагал...

1020 гадоў... 4000 гадоў... Вечнасць... У кожным з гэтых аб'ёмаў часу жыве Віцебск і тыя людзі, якія далі яму на творчы пажытак гэтае жыццядайнае імя. Бо ў слова "Віцебск" урасло слова "вітэ", якое на латыні азначае — жыццё.

* * *

Спаўняецца 965 гадоў ад нараджэння (1029) і 950 гадоў ад пачатку княжання ў Полацку Усяслава Чарадзея. Усяслаў Брачыславіч валадарыў з 1044 па 1101 гг. У 1055 годзе, каб паказаць свету роўнасць Полацка з Ноўгарадам і Кіевам, узвёў Сафійскі сабор. Пры ім княства — нашае першае дзяржаўнае ўтварэнне — дасягнула найвышэйшага ўздыму. Марская дзяржава мела выхад да Варажскага (Балтыйскага) мора, па сіле і магутнасці саперничала з такімі гаспадарствамі, як Польскае каралеўства, Ноўгарадскае княства. Па тэрыторыі было роўнае герцагству Баварскаму, каралеўству Партугальскаму. Апроч Полацка, Усяслаў у сваім падначаленні меў яшчэ 18 гарадоў, у тым ліку і Крывіч-горад, які потым стане называцца Вільняю.

Усяслава Брачыслававіча праваслаўні Чарадзеем. Сучаснікі і нашчадкі верылі, што гэтага князя нябесныя сілы надзялілі вечнаю душою, што ён умеў перакінуцца ў шэрага ваўка, у яснага сокала, у тура з залатымі рагамі. Ужо пры жыцці пра Усяслава складалі паданні.

Многа ўзнёслых слоў прысвяціў яму аўтар (а мо і зямляк?) "Слова пра паход Ігаравы": "Усяслаў-князь людзям чыніў суды, радзіў князям гарады, а сам уначы ваўком рыскаў, з Кіева паспяваў да пеўняў да Тмутаракані, Хорсу вялікаму шлях перацінаў".



ПА ГАРЫЗАНТАЛІ: 4. Цырк на дроце. 8. Паддача ў лазні. 9. Гаспадарка, дзе ўсё нічыйнае. 11. Ветэран з Усходу. 12. Пах вышэйшага гатунку. 13. Надта многа (размоўн.). 16. Лясны жыхар пад капялюшыкам. 18. Орган цела, які працягваюць, калі ўзнікае небяспека працягнуць ногі. 19. Дзяржаўны орган, які павінен нас берагчы. 20. Стан, якому ніхто не абрадуецца. 22. Першы, але не камяком. 23. Дадатак да тавару — аб'ект смутку і роспачы. 24. Найпрасцейшае.

ПА ВЕРТЫКАЛІ: 1. Рыбіна, якая можа спатрэбіцца пры нарыхтоўцы дроў. 2. Прылада для перакульвання Зямлі. 3. Месца павароту няпрошанага госця. 5. Пастух — вынаходнік джынсаў. 6. Творца бочак і цэбраў. 7. Частка дрэва, на якую можна напарацца. 8. Спісванне на вышэйшай стадыі. 10. Спосаб высвятлення адносін (forte, presto). 11. Пастаўлены перадфактам (газетн.). 14. Цэнтр адукацыі і выхавання ў п азакласны час. 15. Марская ўборачная. 17. Афрыканскае дрэва з дзвюх літар. 21. Напітак, часта згадваемы ў пірацкім фальклоры.

Даслаў Леанід РАЗЛАДАЎ.

Адказы на крыжаслоў, змешчаны ў № 51

ПА ГАРЫЗАНТАЛІ. 1. Прысмак. 4. Рабства. 7. Кардыяграма. 9. Вапна. 10. Стапа. 11. Скетч. 13. Зацірка. 14. Рэастат. 15. Палітык. 17. Сімвэін. 19. Пакля. 20. Ранец. 22. Акцыя. 23. Кампенсацыя. 24. Трактат. 25. Ігрышча.

ПА ВЕРТЫКАЛІ: 1. Паравоз. 2. Мерка. 3. Крытыка. 4. Рэгістр. 5. Брамс. 6. Антракт. 7. Кіліцільнік. 8. Амартызацыя. 11.Скрыпка. 12. Чэхія. 15. Парытэт. 16. Канверт. 17. Слупскі. 18. Ніягара. 21. Тамат. 22. Асцёр.

ХАТНІ ЭКРАН

21, субота

Беларускае тэлебачанне

11.05. Тыдзень планеты.
◆11.20. "Дакрананне рукі".
* 13.05. Мультфільм.
13.15. "Сталіца". Тэлечасопіс.
13.35. ТА "Рэха". 20 хвілін рэдактара.
* 13.55. "Мой маленькі поні".
◆14.25. "Адзінаццатага ліпеня".
15.55. І Рэспубліканскі тэлевізійны фестываль юных талентаў.
17.25. Сустрэча з паэтэсай В.Аколавай.
18.25. "Гінес-шоу".
* 18.55. "Чарапашкі ніндзя".
19.30. "Нов і К"- топ-10.
20.30. Пяць хвілін на жарты.
20.35. Калыханка.
21.00. Панарама.
21.35. Пад купалам Сусвету.
◆21.45. "Гонар сям'і Прыцці".
23.40. Не забудзьцеся ўключыць тэлевізар.
23.50. "Гонкі для Беларусі".
0.10. "Каскад".
0.25. Хакей. Чэмпіянат Беларусі.
01.00. Відзьма-нявідзьма.

Канал "Астанкіна"

11.20. Прэм'ера д/ф "Яго вялікасць футбол".
◆11.50. "Тайна рукапіснага карана".
13.20. Тэлескоп.
14.00. Навіны.
14.25. Вагон 03.
* 14.35. "Таямнічы свет 02" (Аўстралія). 1-я серыя.
15.05. Лабірынт.
15.35. Служэнне муз не церпіць мітусні.
16.05. Вайна ў Карэі (1950–1953гг.). Аўтар Д.Валкагонаў.
16.35. "Жыццё заапаркаў".
17.15. Каханне з першага погляду.
17.55. Да і пасля.
◆18.45. "Месца, дзе табе добра". 3-я серыя.
19.40. Добрай ночы, малышы
20.00. Навіны плюс.
20.35. Надвор'е.
◆20.45. "Месца, дзе табе добра". 4-я серыя.
21.40. Што? Дзе? Калі?
22.45. Пад знакам задыяка. Цялец.

Канал "Расія"

◆11.05. "Вёска Утка".
* 12.30. "Малышка Яном".
12.40. Сялянскае пытанне.
13.20. "Дарогу адолее той, хто ідзе".
13.50. Ізабэль. Забаўляльная віктарына.
14.35. "І поміць нездарма ўся Расія". Д/ф.
15.35. Футбол без граніц.
16.10. Магія Дэвіда Каперфільда.
17.00. Валейбол. Расія – Японія.
18.15. Свята кожны дзень.
18.25. Вуснамі дзіцяці.
◆19.25. "Раганосца".
20.55. "Гарадок". Забаўляльная праграма.
21.25. Зусім сакрэтна.
22.40.Аўтаімгненне.
22.45. Зоркі гавораць.
22.50. Спартыўная карусель.
22.55. Праграма "А".
◆23.55. "Тры дні Віктара Чарнышова".

Санкт-Пецярбург

10.30. Хуткая дапамога.
11.00. Канцэрт па заяўках.
11.30. Тэледактар.
◆12.00. "Бывайце, галубы".
◆13.40. "Мільён прыгод. Востраў Іржавага генерала".
14.45. Спартыўны агляд.
15.15. "Кінаўспаміны. Спадчына".
18.00. Зебра.
16.45. Вялікі фестываль.
17.00. Аўтапілот.
17.15. Крымінальнае дасье.
17.35. "Вечная памяць".
18.10. Экспрэс-кіно.
18.30, 21.45. Інфарм ТБ.
18.55. "Слова Андронікава".
20.00. Слявае Яўгенія Смальянінава.
◆20.15. "Соф'я Пятроўна".
22.00. Ваш стыль.
22.10. Адам і Ева +.
◆22.40. "Фатаграфіі на сцяне". 1-я серыя.

8-ы канал

* 15.00. "Трансформеры". 8-я і 7-я серыі.
16.00. "Разважанні пра джаз".
◆16.50. "Жыццё па лімоту".
18.00. Бізнес-план.
◆19.00. Прыгодніцкі серыял "Залёў небяспечны". "Каварная рака".
19.30. Давайце патанцуем. Музычная праграма.
* 20.00. Праграма мультфільмаў.
20.30. "Зорныя дзеці" з цыкла "Пані Удача".
21.00. СОЛТЭК, "Спартыўная мазаіка".
21.30. "Сем мінут з Хрыстафорам".
◆21.40. "Кветка страсці". 8-я і 7-я серыі.

22, нядзеля

Беларускае тэлебачанне

8.00. Раніца рэспублікі.
8.10. Пад купалам Сусвету.
8.20. Пяць хвілін на жарты.
8.25. Слова да чалавека.
* 8.55. "Чарапашкі ніндзя".
9.30. Нядзельная пропаведзь ксяндза Уладзіслава Завальнюка.
9.40. Справы вайсковыя.
◆10.25. "Каралеўства алмазаў" (Індыя).
* 12.20. Мультфільм.
12.35. Аэробіка.
13.10. Тэлевізійны шашачны клуб.
13.40. МТУ. Лепшыя хіты.
14.10. АВС-клуб.
* 14.25. "Мульт-хіт-парад".
14.45. Вяскоўцы. Перадача з Гомеля.
15.15. І Рэспубліканскі тэлевізійны фестываль юных талентаў.
16.45. "Гінес-шоу".
* 17.15. "Чарапашкі ніндзя".
17.50. Тэлекрама.
18.05. Настальгічны дывертысмент.
19.10. Брамс. Права на любоў.
20.00. Панарама.
20.35. Пад купалам Сусвету.
20.40. Калыханка.
21.00. Пяць хвілін на жарты.
◆21.10."Пан Валадыеўскі".
23.35. Не забудзьцеся ўключыць тэлевізар.
23.45. "Гонкі для Беларусі".

Канал "Астанкіна"

8.00. Без паўзы.
8.30. Раным-рана.
9.00. Палігон.
9.30. Спортлато.
9.45. Пакуль усе дома.
10.15. Разумнікі і разумніцы.
10.55. Марафон-15.
11.40. Карэйскі эпюд.
12.00. Ведзі.
12.30. Дзень добры
* 13.00. "Піф і Геркулес".
13.10. "Падводная адысея каманды Кусто".
14.00, 22.50. Навіны.
14.20. Дыялог у прамым эфіры.
15.00. Клуб падарожнікаў.
15.50. Шпаргалка.
* 16.00. "Кот Фелікс", "Сапраўдныя палянічыя на прывіды".
16.50. Жывое дрэва рамёстваў.
16.55. Футбол. Кубак Расіі.
18.50. Тэлелоцыя.
◆19.00. "Прафесіянал".
21.00. Нядзеля.
21.45. Спартыўны ўік-энд.
22.00. Вялікі тэатр. Дні і вечары.
23.00. Вялікая прагулка.
23.35. Начное жыццё гарадоў свету. Парыж.

Канал "Расія"

7.00, 13.00, 19.00, 22.20. Весткі.
8.25. Добрай раніцы. "Снеданне для чэмпіёнаў".
8.55. Лепшыя гульні НБА.
9.55. Аты-баты...
10.25. "Дэ факта".
◆10.55. "Дарагі мой чалавек".
12.40. Сялянскае пытанне.
13.20.Не высечы...
13.35. "Дарогу адолее той, хто ідзе".
14.35. Сусветная вёска.
15.05. Белая варона.
15.50. Расійская энцыклапедыя.
16.20. Залатая шпора.
* 17.00. "Гуфі і яго каманда", "Чорны плашч".
17.55. Свята кожны дзень.
18.05. Валейбол. Сусветная ліга.
◆19.25. "Доказ".
21.15. Кіно ў чэрвені.
21.30. У Ксюшы.
22.00. Каробка перадач.
22.40. Аўтаімгненне.
22.45. Зоркі гавораць.
22.50. Спартыўная карусель.
◆23.00. "Прывід замка Марысвіль".

Санкт-Пецярбург

◆8.00. "Усяго за даляр" (ЗША).
9.40. Куток Расіі.
10.00. Экспрэс-кіно.
10.15. Сам-насам з музыкай.
11.00. Нядзельны лабірынт.
◆12.30. "Сабака, які слушыў вайну".
13.50. Этнасы Зямлі.
14.15. Гістарычны альманах.
◆15.00. "Тайна рэчыва".
16.25. Дж.Верді. "Аіда".
18.55. Інфарм ТБ.
◆19.20. "Забіць дракона".
21.20. Ваш стыль.
21.30. "Дом кіно".
◆22.30. "Фатаграфіі на сцяне". 2-я серыя.

8-ы канал

* 15.00. "Трансформеры". 8-я, 9-я і 10-я серыі.
16.10. Спартыўная паралель.
17.00. Нямецкая хваля.
◆17.30. "Ускосныя ўлікі" з цыкла "Зігзагі жыцця".
18.00. СОЛТЭК. "Тэлефон", "Вуліца".
18.30. "Дзікая Амерыка".
19.00. "Зорныя дзеці" з цыкла "Пані Удача".
19.30. Спорт-сакрэт.
20.00. "Скрытая камера". Камедыйнае шоу.
◆20.20. "Кветка страсці".8-я, 9-я і 10-я серыі.
22.40. "Фокс мозак". Музычная праграма.

23, панядзелак

Беларускае тэлебачанне

10.25. Пад купалам Сусвету.
10.35. Пяць хвілін на жарты.
* 10.40. "Чарапашкі ніндзя". 8-я серыя.
11.10. Э.Радзінскі. "Забіць мужчыну". Спектакль. Частка 1-я.
11.55. "Зрабі сабе кар'еру".
12.30. Рок-айленд-шоу.
13.30. Навіны.
13.40. Сустрэча з драматургам А.Папоавым.
13.50. А.Папова. "Аб'ява ў вячэрняй газеце". Спектакль.
15.55. ТБ – школе. Выяўленчае мастацтва.
◆16.15. "Руіны страляюць..." 1-я серыя.
17.30. Навіны.
17.40. "Бярэзінскі запаведнік" Д/ф.
18.10. Абласныя навіны (Брэст).
18.25. Навіны Бі-бі-сі.
19.00. Э.Радзінскі. "Забіць мужчыну". Спектакль. Ч.2-я.
19.45. Аэробіка.
20.20. Выступленне Старшыні праўлення Белспажыўсаюза.
20.30. Кантакт.
20.35. Калыханка.
21.00. Панарама.
21.35. Пад купалам Сусвету.
21.45. Пяць хвілін на жарты.
21.50. "Талесяброўка".
21.55. Спартыўны тэлекур'ер.
22.15. Надвор'е.
22.25. Памяці артыста Ю.Казючыца.
22.55. НІКа.
◆23.10. "Чорная кобра". Італія.

Канал "Астанкіна"

5.15. Раніцкая размінка.
5.30. Раніца.
7.45. Фабнэшл таймс.
8.00, 11.00, 14.00, 17.00, 20.00, 23.20. Навіны.
8.20. Паглядзі, паслухай...
◆8.40. "Гарачаў і іншыя".
9.20. Віктарына ФФА.
9.50. Агарод круглы год.
10.20. Зорная гадзіна.
11.20. Што? Дзе? Калі?
14.25. Прадпрымальнік.
15.20. Іграе Віктар Грыдзін (баян).
15.30. Новыя імёны.
16.10. Зорная гадзіна.
16.50. Тэхнадром.
17.25. Віктарына ФФА.
17.55. Дакументы і лёсы.
18.05, 20.35. Надвор'е.
◆18.10. "Гарачаў і іншыя". 27-я серыя.
18.40. Мініяцюра.
18.55. Праграма У.Познера.
19.40. Добрай ночы, малышы
20.45. Аналог.
20.55. А.Мілер. "Пасля грэхападзення". Спектакль.
23.30. Прэс-экспрэс.
23.40. Новыя абыявацелі.

Канал "Расія"

16.50. Выратаванне 911.
17.45. Свята кожны дзень.
◆18.00. "Спрут-5". (Італія). 2-я с.
19.00, 22.20. Весткі.
19.25. Падрабязнасці.
◆19.35. "Спрут-5". Працяг.
20.40. Экспацэнтр прадстаўляе.
20.50. Сам сабе рэжысёр.
21.20. Без рэтушы.
22.40. Аўтаімгненне.
22.45. Зоркі гавораць.
22.50. Спартыўная карусель.
22.55. Экран крымінальных паведамленняў.
23.Аніматака.

Санкт-Пецярбург

7.45. Чароўная лінія.
* 8.05. Мультфільм.
8.15. Зебра.
9.00. "Нямецкая хваля".
◆9.30. "На парозе ночы".
10.20, 11.40, 15.40. Музычны момант.
10.30. Хуткая дапамога.
11.00. Адам і Ева плюс.
11.30, 15.30, 18.30, 21.45. Інфарм ТБ.
11.45. Чароўная лінія.
15.45. "Танга над востравам". Д/ф.
16.15. Новы Пецярбург.
16.46. Вялікі фестываль.
17.00. "Горад і вада". Тэлефільм.
17.10. Адкрываю для сябе Расію.
◆17.40. "На парозе ночы".
18.50. Спорт, спорт, спорт...
19.05. Будні.
19.20. Тэлемагазін.
◆19.25. "Невераго дныя прыгоды італьянцаў у Расіі".
* 21.05. "Густаў".
21.15. Свет мастацтва.
22.00. Спартыўныя навіны.
22.10. Ваш стыль.
22.20. Дадатак да праграмы "Свет мастацтва".

8-ы канал

◆18.00. "Карусель".
18.25. Музычная праграма.
19.00. Паліцэйскі серыял "Хіл Стрыт Блюз". "Сябры дапамогуць".
* 20.00. "Вальтрон".
◆20.30. "Марэна Клара". 11-я серыя.
21.15. Ля афішы.
◆21.35. "Дзяўчаты".
23.10. Музычная праграма.

24, аўторак

Беларускае тэлебачанне

8.00. Раніца рэспублікі.
8.10. Дзелавая хроніка.
8.20. Пад купалам Сусвету.
8.30. Надвор'е.
8.40. Пяць хвілін на жарты.
8.45. "Сярод скал". Д/ф.
9.00. ТБ – школе. Выяўленчае мастацтва.
◆9.20. "Чорная кобра". (Італія).
10.55. Песню бярыце з сабою. Клецкі раён.
12.20. "У.Высоцкі. "Маналог".
13.20. Сёння – Дзень славянскага пісьменства і культуры.
13.30. Навіны.
13.40. АВС-клуб.
13.55. "Еўрапейскі калейдаскоп".
14.25. "Нов і К"-топ-10.
15.25. ТБ – школе. Мастацкі музей Беларусі.
15.55. Незабыўнае. Расказвае ветэран вайны Н.П.Ермак.
◆16.30. "Руіны страляюць..." 2-я серыя.
17.30. Навіны.
17.40. "Дняпроўская вясна-94". Шахматны фестываль.
18.00. Дзелавая хроніка.
18.10. Абласныя навіны (Віцебск).
18.25. Навіны Бі-бі-сі.
19.00. Дабрачынная акцыя творчага аб'яднання "Крок" і Беларускага рэспубліканскага таварыства "Дзеці ў бядзе".
20.20. Зачытайце маё пісьмо...
20.25. Пяць хвілін на жарты.
20.30. Кантакт.
20.35. Калыханка.
21.00. Панарама.
21.35. Пад купалам Сусвету.
21.45. Працяг дабрачыннай акцыі.
23.45. Надвор'е.
23.55. НІКа.
00.10. Футбол. Таварыскі матч. Алімпійская зборная Беларусі – алімпійская зборная Украіны. 2-гі тайм.

Канал "Астанкіна"

5.15. Раніцкая размінка.
5.30. Раніца.
7.45. Агляд рынку нерухомасці.
8.00, 11.00, 14.00, 17.00, 20.00, 23.10. Навіны.
* 8.20. "Сем дзён з Морсі".
8.30. Дзень славянскай пісьменнасці і культуры. Трансляцыя набажэнства з Успенскага Патрыяршага сабора.
9.40. Чалавек і закон.
10.10. Рок-урок.
10.50, 23.20. Прэс-экспрэс.
11.20. Тэніс. Адкрыты чэмпіянат Францыі.
11.50. Дзень славянскай пісьменнасці і культуры. Трансляцыя са Славянскай плошчы ў Маскве.
14.25. Прадпрымальнік.
15.10. Справа.
* 15.20. "Прыгоды Тома Соера" (Японія).
15.50. Паміж намі, дзяўчынкамі...
16.10. Рок-урок.
16.50. Азбука ўласніка.
17.25. Планета.
17.35. Дакументы і лёсы.
17.45, 20.35. Надвор'е.
◆17.50. "Раскол". 7-я с.
18.45. З першых рук.
18.55. Тэма.
19.40. Добрай ночы, малышы
20.45. Бамонд.
21.00. Канцэрт, прысвечаны Дню славянскай пісьменнасці і культуры.
22.30. Вестуны.
23.30. Акадэмія.

Канал "Расія"

6.00, 10.00, 15.00, 19.00, 22.20. Весткі.
7.30. "Аловесць аб славянскай пісьменнасці". Д/ф.
8.00. Сусветныя навіны Эй-бі-сі.
8.30. Раніцні канцэрт.
8.45. Без рэтушы.
9.40. Сялянскае пытанне.
* 15.20. Мульці-пульці.
15.50. Там-там навіны.
16.05. Тэлегазета.
16.10. Прыгоды ваўчара.
16.30. Новая лінія.
17.15. Здарова жывеш.
17.30. Гаспадар.
18.00. Свята кожны дзень.
18.10. Кар'ера.
19.25. Падрабязнасці.
19.35. Нікто не забыты.
◆19.40. "Санта-Барбара".
20.30. Фільм-прэм'ер.
20.45. Майстры. Ігар Майсееў.
21.50. Я – лідар.
22.40. Аўтаімгненне.
22.45. Зоркі гавораць.
22.50. Спартыўная карусель.
22.55. "Бет Дэвіс" Д/ф.

Санкт-Пецярбург

7.45. Чароўная лінія.
* 8.05. Мультфільмы.
8.25. Д/ф.
9.00. "Нямецкая хваля".
◆9.30. "На парозе ночы".
10.15. Тэлемагазін.
10.20, 11.40, 15.40. Музычны момант.
10.30. Хуткая дапамога.
11.00. Тэледактар.
11.15. "Чорная быль, ці Праз восем гадоў".
11.30, 15.30, 18.30, 21.45. Інфарм ТБ.
11.45. Чароўная лінія.
15.45. Запрашае Кастрама.
15.55. Канцэрт ансамбля "Юны ленінградзец".
16.25. Дзецям пра зверанят.
16.45. Вялікі фестываль.
17.10. Ваша права.
◆17.40. "На парозе ночы".
18.50. Спорт, спорт, спорт...
19.05. Будні.
19.20. Тэлемагазін.
19.25. Музычны фільм.
◆19.40. "Саракавы дзень".
20.45. "Поль Персон". Тэлефільм.
22.00. Спартыўныя навіны.
22.10. Ваш стыль.
22.20. Фестываль кінастудыі "Выбар".

8-ы канал

◆18.00. "Карусель".
18.25. Музычная праграма.
◆19.00. "Лабірынт правасуддзя", "Выключнае абякуспіва".
19.50. Студыя "ІНТЭКС". Навіны.
* 20.00. "Вальтрон".
◆20.30. "Марэна Клара". 12-я серыя.
21.20. "Антыльскія астравы".
◆21.45. "Ні жывы, ні мёртвы".

25, серада

Беларускае тэлебачанне

8.00. Раніца рэспублікі.
8.10. Пад купалам Сусвету.
8.20. Надвор'е.
8.30. Пяць хвілін на жарты.
* 8.35. Мультфільмы.
9.00. ТБ – школе. Мастацкі музей Беларусі.
9.30. Аэробіка.
10.05. Песню бярыце з сабою. Ч.2-я.
11.25. Футбол. Таварыскі матч. Алімпійская зборная Беларусі – Алімпійская зборная Украіны. 2-гі тайм.
13.30. Навіны.
* 13.40. "Два клёны".
14.20. Відзьма-нявідзьма.
◆15.20. "Руіны страляюць..." 3-я і 4-я с.
17.30. Навіны.
17.40. Кубак Беларусі па культурызму.
18.10. Абласныя навіны (Гомель).
18.25. Навіны Бі-бі-сі.
19.00. Футбол. Таварыскі матч. Зборная Украіны – зборная Беларусі.
20.50. Кантакт.
21.00. Панарама.
21.35. Пад купалам Сусвету.
21.45. Пяць хвілін на жарты.
21.50. "Карамболь". Ток-шоу з удзелам Г.Вашчанкі.
22.25. Стоп-кадр.
22.40. Надвор'е.
22.50. "Дзесяць хвілін плюс стагоддзе". Перадача 4-я.
◆23.00. "Патрон". 1-я с.

Канал "Астанкіна"

8.00, 11.00, 14.00, 17.00, 20.00, 22.55. Навіны.
8.20. Домісолька.
◆8.35. "Сабака, які ўмеў спяваць". 1-я с.
9.40. Клуб падарожнікаў.
10.30. Джэм.
11.20., 22. 45. Прэс-экспрэс.
11.30. Тэніс. Адкрыты чэмпіянат Францыі.
14.25. Прадпрымальнік.
* 15.20. "Прыгоды Тома Соера" (Японія).
15.50. Джэм.
* 18.20. "Пятаючы дом".
18.50. Загадка СБ.
17.25. Міждзяржаўная тэлерадыёкампанія "Мір".
17.50, 20.35. Надвор'е.
◆17.55. "Раскол". 8-я серыя.
18.55. Чалавек не з мусоўкі. Аўтарская праграма Э.Разанава.
19.40. Добрай ночы, малышы
20.45. Вагон 03.
20.55. У пошуках страчанага.
◆21.35. "Анастасія – загадка Ганны". (ЗША). 1-я серыя.
23.05. Жыццяпіс.
23.35. Музычная праграма.

Канал "Расія"

8.00, 10.00, 15.00, 19.00, 22.20. Весткі.
7.00. Час дзелавых людзей.
7.30. Добрай раніцы.
8.00. Навіны Эй-бі-сі.
8.30. Раніцні канцэрт.
◆8.45. "Санта-Барбара".
9.35. Тэлегазета.
9.40. Сялянскае пытанне.
10.05. М-трэст.
10.20. Новая лінія. "Далёкі Усход".
17.05. Іванаўскі кумір.
17.20. "Жанчыны свету" (ЗША).
17.45. Свята кожны дзень.
17.55. Рубяжы.
18.10. L-клуб.
19.25. Падрабязнасці.
◆19.35. "Санта-Барбара".
20.25. Нікто не забыты.
20.30. Рэпарцёр.
20.45. Шостае пачуццё.
21.20. На палітычным алімпе.
22.40. Аўтаімгнение.
22.45. Зоркі гавораць.
22.50. Спартыўная карусель.
◆22.55. "З каханымі не разлучаецеся".

Санкт-Пецярбург

* 8.00. "Чорная курыца".
8.20. Кідайка.
9.00. Нямецкая хваля.
◆9.30. "На парозе ночы".
10.20, 11.40, 15.40. Музычны момант.
10.30. Хуткая дапамога.
11.00. Кірмаш вакансій.
* 11.15. Мультфільм.
11.25. З-за вострава на стрыжань.
11.30, 15.30, 21.45. Інфарм ТБ.
11.45. Чароўная лінія.
15.45. Урок нямецкай мовы.
16.05. "Крыжыкі-нулікі".
16.45. Вялікі фестываль.
17.10. Армія Расіі.
◆17.40. "На парозе ночы".
18.50. Спорт, спорт, спорт...
19.05. Будні.
19.20. Тэлемагазін.
19.25. П.Гамара. "Забойцы – Ганкуравуская прэмія". Спектакль.
22.00. Спартыўныя навіны.
22.10. Ваш стыль.
22.20. Фестываль кінастудыі "Выбар".

8-ы канал

◆18.00. "Карусель".
18.20. Музычная праграма.
18.50. Журфак БДУ прадстаўляе...
◆19.00. "Хіл Стрыт Блюз", "Дзева Марыя і Індык".
19.50. Навіны.
* 20.00. "Вальтрон".
◆20.30. "Марэна Клара". 13-я серыя.
21.20. Хатні ўрач.
◆21.45. "Гарбун".

Организация реализует

оптом книги

из серии "Американский боевик" :

– Микки Спиллейн "Отряд палачей" (2т.);

– Ник Кварри "Смерть – моя тень" (3т.).

Оплата по безналичному расчёту (предоплата).

Справки по телефону в Минске: 68-28-13, 68-25-41, факс (0172) 32-21-03.

25, чацвер

Беларускае тэлебачанне

8.00. Раніца рэспублікі.
8.10. Пяць хвілін на жарты.
8.15. Пад купалам Сусвету.
8.25. Надвор'е.
◆8.35. "Патрон". 1-я серыя.
10.30. "Дзесяць хвілін плюс стагоддзе".
12.30. Фільм-канцэрт.
13.30. Навіны.
15.30. Конкурс піяністаў імя І.А.Цвятаевай.
◆16.20. "Руіны страляюць..." 5-я серыя.
17.30. Навіны.
17.40. Праграма міласэрнасці.
18.10. Абласныя навіны (Гродна).
18.25. Навіны Бі-бі-сі.
19.00. Зачытайце маё пісьмо...
19.05. Актуальнае інтэрв'ю.
19.30. Праблемы якасці прадуктаў харчавання.
19.40. Партрэт на фоне часу.
20.10. Пазіцыя ўрада.
20.25. Пяць хвілін на жарты.
20.30. Кантакт.
20.35. Калыханка.
21.00. Панарама.
21.35. Пад купалам Сусвету.
◆21.45. "Патрон". 2-я серыя.
22.35. Надвор'е.
22.45. "Валяніцінаў дзень".
23.05. НІКа.
◆23.20. "Патрон". 3-я серыя.

Канал "Астанкіна"

8.00, 11.00, 14.00, 17.00, 20.00, 22.55. Навіны.
◆8.20. "Сабака, які ўмеў спяваць". 2-я серыя.
9.30. У свеце жывёл.
10.10. ...Да 18 і старэйшым.
10.50, 22.45. Прэс-экспрэс.
11.20. Тэніс. Адкрыты чэмпіянат Францыі.
14.25. Прадпрымальнік.
15.05. Як дабіцца поспеху.
* 15.20. "Прыгоды Тома Соера" (Японія).
15.50. Канцэрт.
16.10. ...Да 18 і старэйшым.
16.50. Тэхнадром.
17.25. Планета.
17.50, 20.35. Надвор'е.
◆17.55. "Раскол". 9-я серыя.
18.55. Кіналанарама.
19.40. Добрай ночы, малышы
20.45. Лато "Мільён".
21.15. "Ад Лешчанкі да Лешчанкі". Музычная праграма.
23.00. Футбол. Таварыская сустрэча. Зборная Даніі – зборная Швецыі. Перадача з Даніі.

Канал "Расія"

8.00, 10.00, 15.00, 19.00, 22.20. Весткі.
8.00. Навіны Эй-бі-сі.
8.25. Чароўны куфэрачак.
8.35. Паехалі.
◆8.45. "Санта-Барбара".
9.35. Тэлегазета.
9.40. Сялянскае пытанне.
15.20. Студыя "Рост".
15.50. Там-там навіны.
16.05. Новая лінія.
* 16.50. "Сустракайце бабулю".
17.00. Будні.
17.45. Свята кожны дзень.
17.55. У свеце аўта- і мотаспорту.
18.25. Сала гулькіна.
19.25. Падрабязнасці.
◆19.35. "Санта-Барбара".
20.25. "Настальжы". Музыка ўсіх пакаленняў.
21.00. Звычайная справа.
21.20. Абчына мая. "Пераўтварэнне".
22.40. Аўтаімгненне.
22.45. Зоркі гавораць.
22.50. Спартыўная карусель.
22.55. Экран крымінальных паведамленняў.
23.05. Балет Санкт-Пецярбурга.

Санкт-Пецярбург

* 8.05. Мультфільмы
8.40. Дзецям пра зверанят.
9.00. "Нямецкая хваля".
◆9.30. "На парозе ночы".
10.20, 11.40, 15.40. Музычны момант.
10.30. Хуткая дапамога.
11.00. "О-ля-ля" прадстаўляе.
11.30, 15.30, 18.30, 21.45. Інфарм ТБ.
11.45. Чароўная лінія.
15.45. Падарожжа па Усходзе.
* 16.05. "Урокі музыкі".
16.15. "Там, дзе жыве Павуціньч".
16.25. Сёння і штодзённа.
16.45. Вялікі фестываль.
17.10. Чалавек на зямлі.
◆17.40. "На парозе ночы".
18.50. Спорт, спорт, спорт...
19.05. Будні.
19.20. Тэлемагазін.
◆19.25. "Ластаўкі і верабеі".
20.50. Ваш стыль.
21.00. Блеф-клуб.
22.00. Спартыўныя навіны.
22.10. Чэмпіянат Расіі па футболу. 1-я ліга. "Змена-Салют" (Санкт-Пецярбург) – "Асмарал" (Масква). 2-гі тайм.
22.55. "Вячорні звон". Музычны канал: (22.55) – "Рокс-галактыка"; (23.10) – Парад парадаў; (23.40) – Шлягер-94.

8-ы канал

◆18.00. "Карусель".
18.20. Музычная праграма.
◆19.00. "Лабірынт правасуддзя", "Свае і чужыя".
* 20.00. "Вальтрон".
◆20.30. "Марэна Клара". 14-я серыя.
21.25. "Файт". Кікбоксінг.
◆21.45. "Нябачны забойца".
23.10. Музычная праграма.

27, пятніца

Беларускае тэлебачанне

8.00. Раніца рэспублікі.
8.10. Дзелавая хроніка.
8.20. Пад купалам Сусвету.
8.30. Надвор'е.
8.40. Пяць хвілін на жарты.
8.45. Урокі здароўя.
◆9.10. "Патрон". 2-я серыя.
10.00. "І не пакіну шабе..." Міжнародная праграма міласэрнасці.
◆10.30. "Патрон". 3-я серыя.
11.50. "Карамболь". Ток-шоу з удзелам Г.Вашчанкі.
13.30. Навіны.
13.40. Пазіцыя ўрада.
13.55. Фільм-канцэрт.
14.45. Тэлекарыс пра настаўніка геаграфіі А.У.Пракоф'ева.
15.20. ПІК.
16.00. Майстэрня. Г.Буралкін.
◆16.15. "Руіны страляюць..." 6-я серыя.
17.30. Навіны.
17.40. Тэлекарыс пра паэта К.Жука.
18.00. Дзелавая хроніка.
18.10. Абласныя навіны (Магілёў).
18.25. Навіны Бі-бі-сі.
19.00. Навошта дадзена ўлада? Партызанскі раён Мінска.
19.45. Расказвае І.П.Антонаў, былы батальённы ваенфельчар.
20.15. Студыя "Тэлесяброўка". Падарункі на добры настрой.
20.25. Пяць хвілін на жарты.
20.30. Кантакт.
20.35. Калыханка.
21.00. Панарама.
21.35. Пад купалам Сусвету.
◆21.45. "Патрон". 4-я серыя.
22.55. Надвор'е.
23.05. Рэйтынг.
23.20. НІКа.
◆23.35. "Мы вясёлыя, шчаслівыя, таленавітыя".

Канал "Астанкіна"

5.15. Раніцкая размінка.
5.30. Раніца.
* 7.45. "Дзяўчынка і лер".
8.00, 11.00, 14.00, 17.00, 20.00, 23.00. Навіны.
8.20. Сарока.
* 8.40. "Замочак з сакрэтам".
9.00. Тэлешоу "50 х 50".
10.20. Амерыка з М.Тарапутам.
10.50, 0.35. Прэс-экспрэс.
11.20. Тэніс. Адкрыты чэмпіянат Францыі.
11.50. Футбол. Таварыская сустрэча. Зборная Даніі – зборная Швецыі. 2-гі тайм.
14.25. Прадпрымальнік.
14.50. Бізнес-клас.
◆15.05. "Шуры-муры".
15.35. Алеся і кампанія.
16.05. "...З іншага боку..."
16.50. Азбука ўласніка.
17.25. Навіны культуры.
17.40. Чалавек і закон.
18.10, 20.35. Надвор'е.
18.15. Амерыка з М.Тарапутам.
18.45. Поле дуэлю.
19.40. Добрай ночы, малышы
20.45. "Погляд" з А.Любімавым.
◆21.35. "Дэн Огаст" (ЗША). Фільм 5-ы.
22.35. Чалавек тыдня.
23.10. Музагляд.
23.50. Тэніс. Адкрыты чэмпіянат Францыі.
0.20. Аўта-шоу.

Канал "Расія"

8.00, 10.00, 15.00, 19.00, 22.20. Весткі.
8.20. Патрабуюцца... патрабуюцца...
8.30. Формула-730.
7.00. Час дзелавых людзей.
7.30. "Жоўтая падводная лодка".
8.00. Сусветныя навіны Эй-бі-сі.
8.25. Чароўны куфэрачак.
8.35. Паехалі.
◆8.45. "Санта-Барбара".
9.35. Тэлегазета.
9.40. Сялянскае пытанне.
10.10. Момант істіны.
15.20. Студыя "Рост".
15.50. Там-там навіны.
16.05. Ваенны кур'ер.
16.20. Новая лінія. "Жыццё без жорсткасці".
◆18.50. "Тайна згубленай даліны". 1-я серыя.
17.45. Свята кожны дзень.
17.55. Эстрадная праграма.
18.45. Кіналарафон.
19.25. Падрабязнасці.
◆19.35. "Імперыя страсці" (Японія–Францыя).
21.20. "К-2" прадстаўляе.
22.40. Аўтаімгненне.
22.45. Зоркі гавораць.
22.50. Спартыўная карусель.
◆22.55. "Фамільныя кашмоўнасці" (Італія).

Санкт-Пецярбург

7.45. Чароўная лінія.
* 8.00. "Квартэт ква-ква".
8.10. Па сакрэту ўсяму свету.
8.25. Там, дзе жыве Павуціньч.
8.40. Сёння і штодзень.
9.00. "Нямецкая хваля".
◆9.30. "На парозе ночы".
10.15. Тэлемагазін.
10.20, 11.40, 15.40. Музычны момант.
10.30. Хуткая дапамога.
11.00. Кірмаш вакансій.
* 11.15. Мультфільм.
11.25. З-за вострава на стрыжань.
11.30, 15.30, 21.45. Інфарм ТБ.
11.45. Чароўная лінія.
15.45. "Спарадаўні ядловец".
16.05. Залаты ключ.
* 16.15. "Казка за казкай" і інш.
16.45. Вялікі фестываль.
17.00. "Палац Марлі".
17.10. Новы Пецярбург.
◆17.40. "На парозе ночы".
18.50. Спорт, спорт, спорт...
19.05. Будні.
19.20. Тэлемагазін.
19.25. Пом адкрытых сарцаў.
19.55. "Гэй, людзі!" Спектакль.
21.10. Тэатральная прэзідыя?
22.00. Спартыўныя навіны.
22.10. Ваш стыль.
◆22.20. "Жаночая тайна" (ЗША).

8-ы канал

◆18.00. "Карусель".
18.25. Музычная праграма.
18.55. "Дорэміфасолькі".
◆19.00. "Хіл Стрыт Блюз".
* 20.00. "Вальтрон".
◆20.30. "Марэна Клара". 15-я серыя.
21.20. Час мясцовы.
◆21.40. "Зямля Саннікава".
23.10. Музычная праграма.

28, субота

Беларускае тэлебачанне

8.00. Раніца рэспублікі.
8.15. Пад купалам Сусвету.
◆8.25. "Патрон". 4-я серыя.
9.35. "Роднаму слову" – 15 гадоў.
10.15. Паказвае Гродна.
11.15. Тыдзень планеты.
◆11.30. "Мы вясёлыя, шчаслівыя, таленавітыя!"
13.05. "Сталіца".
13.25. Дарогамі Перамогі.
13.55. Паміж намі, жанчынамі...
* 14.40. "Мой маленькі поні".
15.10. "Што хвалюе эколагаў".
15.45. Фестываль юных талентаў (Віцебск і Віцебская вобласць).
17.15. КВЗ-шоу-94.
* 19.00. "Чарапашкі ніндзя". 9-я серыя.
19.35. "Нов і К"-топ-10.
20.35. Калыханка.
21.00. Панарама.
21.35. Пад купалам Сусвету.
21.45. Пяць хвілін на жарты.
◆21.50. "Разарваны круг".
23.20. НІКа.
23.35. "Каскад".
23.50. Відзьма-нявідзьма.

Канал "Астанкіна"

6.20. Раніцкая размінка.
6.35. Суботняя раніца дзелавога чалавека.
7.10. У свеце матораў.
7.45. Слова пастыра.
8.00. "Марафон-15" – малышам.
8.30. Кампанія "Мір".
9.55. Раніцная пошта.
10.26. Смак.
10.40. Медыцына для цябе.
11.10. "Яго вялікасць футбол". Д/ф.
◆11.40. "Вялікае жыццё".
13.35. У Аджары на страляюць.
14.00. Навіны.
* 14.25. "Таямнічы свет Ог" (Аўстралія). 2-я серыя.
14.55. "Вайна ў Карэі".
15.25. У свеце жывёл.
16.05. Жывое дрэва рамёстваў.
16.10. Цудоўная сямёрка.
17.00. Адкрыццё фестывалю "Кінатаўр".
17.50. Да і пасля...
◆18.45. "Нешта з іншага свету" (ЗША). 1-я серыя.
19.40. Добрай ночы, малышы
20.00. Навіны плюс.
20.35. Надвор'е.
◆20.45. "Нешта з іншага свету" (ЗША). 2-я серыя.
21.35. Што? Дзе? Калі?
23.40. Творчы вечар Л.Рубальскаў.

Канал "Расія"

7.00, 13.00, 18.00, 22.20. Весткі.
7.25. Прэзентацыя праграм Шведскага тэлебачання на РТ.
* 7.30. "Цыркуч Кале і жабяня Боле".
8.10. Студыя "Рост".
8.40. Парламенткі тыдзень.
9.10. Непазнаны Сусвет.
9.40. Пілігрым.
10.25. Зваротны адрас.
11.10. Малюнкі Ф.Дастаеўскага да рамана "Ідыё